

КАМАНДА «ТАНКАВАГА БІЯТЛОНА» ПРА СЯБЕ І КОНКУРС 5

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ВОСЕНЬСКАЙ ХАНДРЫ І ПРАСТУД 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ВЕРАСНЯ 2021 г. СУБОТА № 185 (29554)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Сёння ў адзіночку ніводная краіна не зможа вырашаць ні палітычныя, ні сацыяльныя, ні эканамічныя пытанні. Таму дзяржавы аб'ядноўваюцца, ствараюць ваенныя, ваенна-палітычныя саюзы. Так што яшчэ адной мэтай праціўнікаў Беларусі з'яўляецца стварэнне плацдарма для барацьбы за рынкі і ўплыў на Расійскую Федэрацыю. І санкцыйная палітыка, якая праводзіцца, накіравана на тое, каб задушыць эканоміку, выклікаць незадаволенасць і збіць з панталыку людзей. У нас у краіне захоўваецца мір, парадак і спакой, нягледзячы на цяжкасці. Гэта забяспечана дзякуючы вертыкалі ўлады. Так што мы павінны спакойна глядзець у будучыню, але пры гэтым цвяроза ацэньваць рэчаіснасць».*

# Лазовая расКОШа



У жыхароў вёскі Бабічы Чачэрскага раёна цяпер час нарыхтоўкі бульбы. А як збіраць бульбяны ўраджай без традыцыйнага лазовага кошыка? Сёлета на Чачэршчыне, і асабліва ў навакольных лясах Бабічаў, шмат грыбоў — баравікоў, лісічак, бабак і падасінавікаў, якія, лічы, самі просяцца ў кошык. Вядома, без лёгенькага і зграбнага кошыка тут не абысціся. У вёсцы шмат майстроў, якім сплесці звычайны кош не складае ніякіх праблем. І адзін з такіх умельцаў — пенсіянер, былы дырэктар мясцовай школы Аляксей МАРКОЎСКІ. Наогул, Аляксей Данілавіч — натура творчая: любіць маляваць, упрыгожваць свой двор інсталяцыямі на тэму прыроды, за гэта ён названы найлепшым гаспадаром у раёне. Плесці кошыкі Аляксей Данілавіч навучыўся яшчэ хлапчуком, а цяпер гэтае рамяство прыносіць сапраўднае задавальненне, асалоду.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Актуальныя пытанні

**Уладзімір КАРАНІК:**

## «На ШВЛ вакцынаваных няма»

### Медыкі і губернатар Гродзенскай вобласці адказалі на пытанні па прышчэпках

**Чаму ў Беларусі адсутнічае вакцына Pfizer і іншых заходніх вытворцаў? Чаму пасля прышчэпкі ўсё роўна хварэюць? Як вакцына ўплывае на рэпрадуктыўную сістэму і патэнцыю? Ці павялічваецца пасля прышчэпкі імавернасць інфаркту міякарда, трамбозу, росту анкалагічных утварэнняў? Якой мусіць быць чацвёртая хваля каранавіруса? На пытанні, звязаныя з вакцынацыяй, ад жыхароў Гродзенскай вобласці падчас стрыму на тэлеканале «Беларусь 4 Гродна» адказалі старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК, галоўны пазаштатны інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя, загадчык кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ, доктар медыцынскіх навук, прафесар, народны ўрач Беларусі Ігар КАРПАЎ, начальнік упраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Людміла КЕДА.**

СТАР. 7

Вандроўка патрыёта

## З ПЛЕМЕНІ РАДЗІМІЧАЎ

### Карэспандэнт «Звязды» працягвае знаёміцца з асаблівасцямі сельскага турызму на Магілёўшчыне

**Гэтым разам паклікаў Чэрыкаў. Раён, моцна апалены Чарнобылем (выехала амаль 40 працэнтаў насельніцтва, пахавана 25 населеных пунктаў), але, нягледзячы на ўсё, працягвае развівацца і заставацца ўсё такім жа прывабным для аматараў не глянцавых падарожжаў. Добрая шпаргалка для вандроўнікаў — афіцыйны сайт райвыканкама. З яго можна даведацца пра галоўныя славутасці раёна, а ўжо ў самім Чэрыкаве падкажуць яшчэ шмат іншых. Падарожжа будзе цікава тым, хто ўмее бачыць болей, чым ёсць, і цікавіцца гісторыяй роднага краю. Нагадваю, што сэнс праекта — паказаць, наколькі даступны турызм углыб краіны для тых, хто не мае свайго аўто і гатовы сутыкнуцца з любымі выпрабаваннямі. Яны сапраўды ёсць. Дзесьці з транспартам, дзесьці з харчаваннем. Але, як казаў вядомы паэт і мастак Сярэбранага веку Максіміліян Валошын (а ён з заплечнікам прайшоў шмат розных краін), знаёміцца з мясцовасцю трэба нагамі.**

СТАР. 12

### КОРАТКА

- **Сярэдні заробак у Беларусі ў жніўні склаў Br1463,2.**
- БелАЗ правядзе дзень адкрытых дзвярэй 25 верасня.



- **Творы Янкі Купалы прадставяць у Стамбуле 25 верасня.**
- Незвычайныя домікі і кармушкі для птушак пакажуць на эксвясце ў Мёрах.
- **У Беларусі пройдзе III Форум па пытаннях грамадскага здароўя.**

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2021 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# І днём і ноччу

## Такую задачу № 1 паставіў Прэзідэнт аграрыям

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заслухаў падрабязны даклад міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Івана Крупко аб сітуацыі ў сельскай гаспадарцы ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я. Пра гэта паведаміла прэс-служба кіраўніка краіны.**

У ліку асноўных абмеркаваных пытанняў — зацягнутая сяўба азімых культур і запаволенне тэмпаў уборкі ўраджаю бульбы, у некаторых раёнах — цукровых буракоў, а таксама кукурузы на сілас.

Аляксандр Лукашэнка даў шэраг даручэнняў: у прыватнасці, ураду, кіраўніку Мінсельгасхарча сумесна з губернатарамі актывізаваць сельскагаспадарчыя работы і, калі магчыма, весці сяўбу азімых да позняга вечара, а дзе магчыма, і ноччу. Задача нумар адзін — пасеяць азімыя на працягу тыдня.

Таксама міністру і ўраду даручана праз тыдзень арганізаваць нараду ў кіраўніка дзяржавы з дакладам пра канкрэтныя вынікі праведзенай работы.

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

# «У Беларусі сярод краін СНД самы нізкі паказчык дзіцячай смяротнасці»

**У Беларусі сярод краін СНД самы нізкі паказчык дзіцячай смяротнасці. Аб гэтым заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА сёння на пасяджэнні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, перадае карэспандэнт БелТА.**


Фота БелТА.

Сёння на пасяджэнні Нацкамісіі па правах дзіцяці будуць падведзены вынікі рэалізацыі нацыянальнага плана дзеянняў па паляпшэнні становішча дзяцей і ахове іх правоў на 2016—2021 гады. «Рэалізацыя мерапрыемстваў нацыянальнага плана дзеянняў дала магчымасць значна ўдасканаліць умовы для жыцця і развіцця дзяцей. Ёсць пазітыўныя вынікі. Напрыклад, у Беларусі сярод усіх краін СНД самы нізкі паказчык дзіцячай смяротнасці. Ён таксама ніжэйшы, чым у многіх развітых дзяржаў, уключаючы Вялікабрытанію, Данію, Літву, Польшчу, ЗША. У 2020 годзе каэфіцыент дзіцячай смяротнасці склаў 2,6 на 1 тыс. народжаных жывымі з улікам дзяцей, якія нарадзіліся з экстрэмальна нізкай масай цела. У той час як у 2015 годзе ён быў 3,0», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Паводле яго слоў, у краіне практычна вырашана задача забяспечанасці дзяцей месцамі ў дашкольных установах. «Ахоп дзяцей ва ўзросце ад года да 6 гадоў павялічыўся з 75 працэнтаў у 2016 годзе да 85,2 працэнта ў 2020 годзе. Пры гэтым у мінулым годзе ахоп дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў такімі ўстановамі склаў 100 працэнтаў», — расказаў віцэ-прэм'ер.

За час рэалізацыі нацыянальнага плана дзеянняў атрымалі развіццё сістэмы паліятыўнай медыцынскай дапамогі дзецям і сацыяльнага патранату сем'яў, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. «Дасягнуты пэўныя вынікі па рэалізацыі права дзіцяці жыць і выхоўвацца ў сям'і. Напрыклад, удзельная вага дзяцей-сірот і дзяцей без апекі бацькоў, якія знаходзяцца на сямейных формах уладкавання, вырасла з 78 працэнтаў у 2015 годзе да 83,4 працэнта ў 2020 годзе. Спадзяёмся, што і далей прадоўжым нарошчваць гэты паказчык», — растлумачыў намеснік прэм'ер-міністра. Ён адзначыў, што развіваецца сетка дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. У 2020 годзе адкрыта 15 такіх дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, на выхаванне ў якія перададзена 136 дзяцей, у тым ліку 124 дзіцяці (91 працэнт) з дзіцячых інтэрнатных устаноў.

«У той жа час па-ранейшаму актуальны задачы, звязаныя з павышэннем якасці адукацыі, медыцыны і сацыяльнай дапамогі, развіццём інклюзіі, фарміраваннем у дзяцей і моладзі ўстойлівай патрэбнасці ў здаровым ладзе жыцця. Патрабуе ўдасканалення работа па абароне дзяцей ад насілля, у тым ліку сямейнага, абмежаванні іх ад дэструктыўнай і іншай негатыўнай інфармацыі. Вырашэнне гэтых праблем магчыма толькі пры комплексным і грунтоўным міжведамасным падыходзе. Адпаведныя меры павінны быць уключаны ў нацыянальны план дзеянняў па паляпшэнні становішча дзяцей і ахове іх правоў на наступныя пяць гадоў», — звярнуў увагу Ігар Петрышэнка.

Палітыка

# «Ёсць пункты росту і магчымасці развіваць супрацоўніцтва»

## Наталля Качанава правяла сустрэчу з паслом Малдовы

**Нагода для зацікаўленай гутаркі — заканчэнне кадэнцыі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Віктара Сарачана ў нашай краіне.**


Фота БелТА.

Вітаючы госця ў сценах верхняй палаты парламента, яго спікер выказала ўпэўненасць, што дыпламат застанецца добрым сябрам Беларусі.

Яна адзначыла высокі ўзровень сяброўскіх адносін паміж нашымі краінамі:

— Дыялог, які склаўся на ўсіх узроўнях, — гэта ў многім ваша заслуга, — падкрэсліла Наталля Качанава. — За доўгія гады работы ў Беларусі вы вельмі шмат зрабілі для ўмацавання супрацоўніцтва.

Яна выказала ўпэўненасць, што добрыя адносіны паміж Беларуссю і Малдовай пашырацца па ўсіх кірунках і канструктыўны дыялог на карысць абедзвюх краін будзе працягнуты. У якасці станоўчага прыкладу спікер верхняй палаты беларускага парламента прывяла гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва:

— Нягледзячы на ковідныя праблемы, мы ўбачылі, што за сем месяцаў бягучага года ў нас вырас тавараабарот — гэта вельмі важна, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Акрамя таго, яна звярнула ўвагу на развіццё і гуманітарнага складніка ў двухбаковым парадку дня: у прыватнасці, падзякавала за тое, што ў Кішынёве быў устаноўлены помнік яе земляку Францыску Скарыну.

Спікер выказала ўпэўненасць, што дыялог у такім жа станоўчым рэчышчы паміж краінамі будзе працягнуты:

— Мы разлічваем на такое ж канструктыўнае супрацоўніцтва, — акцэнтавала яна ўвагу. — Разумею, што гэта будзе няпроста, але мы гатовыя: гэта патрэбна нашым народам, нашым людзям, таму мы будзем рабіць усё, каб высокі ўзровень адносін працягваўся і развіваўся, наколькі гэта будзе магчыма.

Наталля Качанава падкрэсліла: беларускі бок адкрыты для розных прапаноў:

— У нас ёсць пункты росту і магчымасці займацца супрацоўніцтвам у сферы гандлю, эканомікі і ў сацыяльным кірунку, — адзначыла яна і звярнула ўвагу на агульны падмурак для супрацоўніцтва. — Я вельмі добра памятаю час, калі мы (краіны былога Савецкага Саюза. — **Заўв. аўт.**) былі разам. Мы разлічваем на вашу дапамогу і падтрымку, наколькі гэта будзе магчыма.

Напрыканцы яна пажадала Віктару Сарачану поспехаў, удачы і дабрабыту ў далейшай прафесійнай дзейнасці.

Са свайго боку дыпламат звярнуў увагу на высокі ўзровень арганізацыі работы беларускіх улад:

— Мне вельмі прыемна было працаваць з усімі галінамі ўлады, — падкрэсліў ён і персанальна падзякаваў Наталлі Качанавай за вырашэнне шматлікіх пытанняў двухбаковага парадку дня, якія знаходзіліся ў яе кампетэнцыі як кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Мне было асабліва прыемна мець стасункі з вамі. Так, мы рэдка бачыліся, але заўсёды вырашалі вельмі сур'ёзныя праблемы і пытанні, я заўсёды ведаў, што ў вашай асобе маю падтрымку.

На сустрэчы з дыпламатам прысутнічаў таксама старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Дзе кожны камень — помнік ім, героям

## У Брэсце адзначылі 50-гадовы юбілей мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»

**Учора ў крэпасці цэлы дзень было шматлюдна. Адна за адной прыбывалі дэлегацыі, ускладалі кветкі, ушаноўвалі памяць абаронцаў каля Вечнага агню. Прадстаўнікі маладзёжных і грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, кіруючых органаў, зарубежныя госці прынялі ўдзел у памятных мерапрыемствах з нагоды юбілею.**

Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» быў урачыста адкрыты 25 верасня 1971 года. Экскурсаводы крэпасці заўсёды падкрэслівалі, што абаронцамі цытадэлі, якія герагічна змагаліся з 22 чэрвеня да канца ліпеня 1941 года, былі воіны 30 нацыянальнасцяў. Ніводны са сцягоў вайсковых часцей, якія на той час стаялі ў крэпасці, не дастаўся ворагу. Усё гэта ўлічвалася пры разглядзе пытання аб прысваенні крэпасці ганаровага звання «Крэпасць-герой». Такое званне яна атрымала ў 1965 годзе. Праз тры гады пачаліся работы па ўзвядзенні мемарыяла, які стаў помнікам мужнасці і гераізму пакалення 1940-х гадоў, што адстаяла краіну.

Сёлета калектыў мемарыяльнага комплексу стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны дзеячам культуры і мастацтва за значны ўклад у захаванне гістарычнай праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, рэалізацыю праекта Саюзнай дзяржавы «Капітальны рамонт, рэстаўрацыя і музеефікацыя збудаванняў Брэсцкай крэпасці ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».

З юбілейнай датай калектыў мемарыяльнага комплексу павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што 22 чэрвеня 1941 года цытадэль стала першым шчытом на шляху гітлераўскай арміі, гарнізон змагаўся да апошняй кроплі крыві. «Мы да гэтай пары не ведаем усіх імёнаў мужных абаронцаў, якія крочылі ў бяссмерце дзеля нас і сваёй краіны», — гаворыцца ў віншаванні.

Дзякуючы карпатлівай рабоце калектыву мемарыяльнага комплексу сучаснікі адкрываюць новыя старонкі абароны крэпасці і захапляюца подзвігам герагічнага пакалення пераможцаў, сказана ў прывітальным адрасе. «Разам з мільёнамі наведвальнікаў з блізкага і далёкага замежжа, якія пабывалі ў мемарыяле за паўстагоддзя, мы схіляем галовы і ў думках дзякуем кожнаму, хто ваяваў тут, за жыццё і чыстае неба над галавой».


Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што дзейнасць калектыву, накіраваная на захаванне праўды аб Вялікай Айчыннай вайне і ролі ў ёй нашага народа, дапамагае выхоўваць сапраўдных патрыётаў, дазваляе Беларусі і далей ствараць сваю будучыню на падмурку народнага адзінства, агульначалавечых каштоўнасцяў, міру і згоды.

Днём на плошчы Цырымоніялаў адбылася ўрачыстая лінейка, прысвечаная памяці абаронцаў. Асноўным мерапрыемствам круглага стала «Мемарыял. 50 гадоў служэння гісторыі» стала прэзентацыя юбілейнага альбома «Брэсцкая крэпасць. Гісторыя і памяць».

А ўвечары ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы прайшло ўрачыстае пасяджэнне з нагоды юбілею крэпасці, дзе заслужаныя ўзнагароды з рук прэм'ер-міністра краіны Рамана Галоўчанкі атрымалі супрацоўнікі мемарыяла.

Нагадаем, што Указам Прэзідэнта ад 22 верасня 2021 года № 361 мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» быў удастоены ордэна Францыска Скарыны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Акцэнты

# Рост цэн і зніжэнне ўраджайнасці

## Уладзімір Макей у ААН папярэдзіў пра глабальныя наступствы «калійных» санкцый

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей папярэджвае, што санкцыйная палітыка ў дачыненні да беларускага калійнага сектара можа ў тым ліку прывесці да зніжэння ўраджайнасці і росту цэн на харчаванне ў свеце. Пра гэта ён заявіў у сваім выступленні на саміце ААН па харчовых сістэмах, паведаміла БелТА.**



Фота БелТА.

Кіраўнік МЗС падкрэсліў, што Беларусь заўсёды ўносіла істотны ўклад у забеспячэнне глабальнай харчовай бяспекі. Краіна экспартуе сельскагаспадарчую прадукцыю і прадукты харчавання ў больш чым 100 краін свету. «Аднак бяздумны санкцыйны ціск заходніх краін на Беларусь ставіць пад пагрозу глабальную харчовую бяспеку. Ва ўмовах каранавіруснай пандэміі вынікі санкцыйнай палітыкі набываюць далёка не радасныя перспектывы ў галіне развіцця і барацьбы з голадам у свеце. Адсутнасць на сусветным рынку беларускіх калійных угнаенняў, якія займаюць 20 % рынку, апрыёры вядзе да значнага зніжэння ўраджайнасці ў сельскай гаспадарцы. Дэфіцыт калійных угнаенняў на сусветным рынку прагназавана прывядзе да росту іх кошту і, як вынік, да росту цэн на прадукты. Недапушчэнне беларускіх калійных угнаенняў на еўрапейскі рынак таксама негатыўна паўплывае на сельскагаспадарчы сектар эканомікі самога ЕС», — заявіў Уладзімір Макей.

У духу Дэкларацыі Сусветнага саміту па харчовай бяспецы Беларусь заклікае адмовіцца ад прымянення санкцый, якія не толькі супярэчаць міжнародным абавязацельствам, у тым ліку ў рамках выканання Парадку дня — 2030, але і ідуць насуперак з палажэннямі Статута ААН і рэзалюцый Генеральнай Асамблеі ААН па аднабаковых прымусовых мерах. «На фоне таго факта, што амаль два мільярды чалавек у свеце недаядаюць, недапушчальна выкарыстанне харчавання і злучальных ланцужкоў у якасці інструмента палітычнага ціску і эканамічнага шантажу», — падкрэсліў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

У сваім выступленні кіраўнік беларускага МЗС адзначыў, што забеспячэнне харчовай бяспекі, ліквідацыя голаду, садзейнічанне ўстойліваму развіццю сельскай гаспадаркі і павышэнню яе вытворчага патэнцыялу з'яўляюцца надзвычай важнымі і прыярытэтнымі задачамі выканання Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года. «Пандэмія COVID-19 і выкліканае ёю запавольванне тэмпаў росту сусветнай эканомікі прывялі да павелічэння маштабаў голаду, у тым ліку ў краінах з сярэднім узроўнем даходу. Наяўнасць выбухованебяспечнага канфліктнага патэнцыялу ў розных пунктах свету, пагроза кліматычных змяненняў пагаршаюць харчовы крызіс і ўзмацняюць уразлівасць нацыянальных харчовых сістэм, забеспячэнне ўстойлівасці якіх з'яўляецца адным з асноўных элементаў на шляху да дасягнення Мэт устойлівага развіцця», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

У Беларусі, адзначыў міністр, нацыянальная харчовая бяспека забяспечваецца ў поўнай меры. Паводле рэйтынгу глабальнай харчовай бяспекі, краіна займае 23-е месца ў свеце. Уладзімір Макей распавёў, што ў Беларусі прынята Дзяржаўная праграма аграбізнесу на 2021—2025 гады, якая прадугледжвае развіццё экалагічна чыстай сельскай гаспадаркі. Асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю арганічнага земляробства. У 2018 годзе ў Беларусі быў прыняты закон аб вытворчасці і перапрацоўцы арганічных прадуктаў, створаны органы па сертыфікацыі арганічных прадуктаў і вытворчых працэсаў. «Гэта забяспечвае паўнавартаснае харчаванне і здаровы лад жыцця насельніцтва краіны», — сказаў ён. Міністр пацвердзіў, што, нягледзячы на існуючыя выклікі і рызыкі, Беларусь мае намер падтрымліваць нацыянальныя дасягненні па праграме Мэт устойлівага развіцця ў частцы ліквідацыі голаду і выкананfolь Парадак дня.

Уладзімір Макей прадаўжае серыю двухбаковых сустрэч і перагавораў у Нью-Ёрку, дзе ён знаходзіцца для ўдзелу ў 76-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У другі дзень работы кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства правёў сустрэчы з калегамі з сямі краін — Венесуэлы, В'етнама, Мазамбіка, Ямайкі, Эстоніі, Сірыі, Венгрыі.

# ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО ДАПАМОГІ

## Прэзідэнцкі спартыўны клуб і Special Olympics на новым этапе супрацоўніцтва

**Клуб рады падставіць плячо Беларускаму камітэту «Спешыял Алімпікс», пад эгідай якога праходзяць розныя мерапрыемствы ў падтрымку развіцця ў Беларусі інклюзіўнага падыходу праз уключэнне людзей з асаблівасцямі здароўя ў спорт і здаровы лад жыцця. Пра гэта заявіў кіраўнік Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый Лукашэнка падчас наведвання рэспубліканскага футбольнага турніру з удзелам жаночых каманд.**

«Гэта не першы сумесны праект Прэзідэнцкага спартыўнага клуба з Беларускім камітэтам «Спешыял Алімпікс». Пад эгідай гэтай арганізацыі праводзіцца шмат важных мерапрыемстваў, таму наш клуб заўсёды рады падставіць плячо дапамогі. Скажу на будучыню: у перспектыве будзе падпісаны двухбаковы мемарандум аб супрацоўніцтве», — адзначыў Дзмітрый Лукашэнка.

Беларускі камітэт «Спешыял Алімпікс» праводзіць маштабную работу па сацыяльнай рэабілітацыі людзей з асаблівасцямі інтэлекту праз заняткі спортам. Штогод ладзяцца рэгіянальныя і рэспубліканскія спаборніцтвы па футболе, баскетболе, настольным тэнісе, плаванні, лёгкай атлетыцы і іншых алімпійскіх відах спорту. Арганізоўваюцца трэніроўкі і адборачныя спаборніцтвы для падрыхтоўкі зборнай Рэспублікі Беларусь да Еўрапейскіх і міжнародных спецыяльных Алімпійскіх гульняў.

Сёлета ў аграгарадку Ула Бешанковіцкага раёна прайшоў футбольны турнір сярод жаночых каманд, які трэніруюцца па сістэме Special Olympics. Спаборніцтвы былі прымеркаваныя да стагоддзя заснавальніцы руху Юніс Кенэдзі Шрайвер.

У 2010 годзе на базе Ульскага ліцэя імя Льва Даватара быў адкрыты цэнтр прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця. На працягу многіх гадоў навучэнцы цэнтра прадстаўляюць Беларусь на міжнародных спаборніцтвах Special Olympics. Прэзідэнцкі спартыўны клуб прывёз дзецям разнастайнае абсталяванне і інвентар для ўмацавання спартыўнай базы ліцэя.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Японія адпрэчыла прапанову Расіі па Курылах

**Токіа адхіляе прапанову Масквы аб стварэнні на паўднёвых астравах Курыльскай грады асаблівай эканамічнай зоны. Пра гэта заявіў кіраўнік МЗС краіны Тасіміцу Матэгі пасля перагавораў з расійскім калегам Сяргеем Лаўровым у Нью-Ёрку, піша «Інтэрфакс» са спасылкай на японскую прэсу.**



Японскі бок план не задаволіў тым, што на тэрыторыі астравоў па-ранейшаму будуць прымяняцца расійскія законы. Гэта, як лічаць у Токіа, ушчамляла б прававую пазіцыю Японіі ў рабоце над сумеснымі эканамічнымі праектамі.

Лаўроў і Матэгі таксама закранулі пытанні мірнага дагавора паміж краінамі — яны дамовіліся працягнуць перагаворы і развіваць адносіны Расіі і Японіі.

Масква і Токіа не могуць падпісаць мірны дагавор па выніках Другой сусветнай вайны з-за тэрытарыяльнай спрэчкі вакол паўднёвай часткі Курылаў. Японія лічыць астравы Ітуруп, Кунашыр, Шыкатан і групу астравоў Хабамаі сваімі «паўночнымі тэрыторыямі». Масква не прызнае самога факта тэрытарыяльнай спрэчкі.

### Зяленскаму прадраклі ўцёкі ў Расію

**Прэзідэнту Украіны Уладзіміру Зяленскаму пагражаюць уцёкі ў Расію. Пра гэта ў сваім Telegram напісаў дэпутат Вярхоўнай рады Аляксей Ганчарэнка.**

Ён прадказаў, што такое развіццё падзей магчыма ў выпадку зацвярджэння ва Украіне законапраекта «Аб алігархах», які ператварае краіну «ў манархію пад кіраўніцтвам Уладзіміра Першага». «Сам Зяленскі будзе вырашаць, хто дрэнны, а хто добры. І адразу пачнецца: не хочаш быць дрэнным, то бяры чамадан грошай і нясі ў офіс прэзідэнта. Уладзімір Аляксандравіч, я хачу вам нагадаць адно, што ўсё гэта ва Украіне не пройдзе і завершыцца адным — Растовам», — напісаў ён.

Нагадаем, што ў лютым 2014 года прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч збег з краіны, прыляцеўшы ў Растоў-на-Доне.

### Пандэмія COVID-19 завершыцца праз год, заявіў кіраўнік Moderna

**Пандэмія каранавіруса можа завяршыцца восенню наступнага года, улічваючы нарастальную вытворчасць вакцын, заявіў генеральны дырэктар амерыканскай фармацэўтычнай кампаніі Moderna Стэфан Бансель.**

«Калі вы паглядзіце на пашырэнне вытворчых магутнасцяў у маштабах усёй галіны за апошнія шэсць месяцаў, то да сярэдзіны наступнага года павінна быць дастатковая колькасць доз, каб усе на гэтай Зямлі маглі быць вакцынаваны», — заявіў Бансель у інтэрв'ю швейцарскай газеце Neue Zurcher Zeitung.

Ён дадаў, што тыя, хто адмовіцца ад прышчэпкі, перахварэюць на каранавірус, паколькі дамінуючы цяпер у свеце штам «дэльта» даволі заразны. Адказваючы на пытанне, ці магчыма вяртанне да звыклага жыцця ў другой палове 2022 года, гендырэктар Moderna заявіў, што так, гэта можа адбыцца праз год.

Шок

# На граніцы знайшлі егіпцяніна без прытомнасці

**Яшчэ адзін пацярпелы мігрант знойдзены на беларуска-польскай граніцы, узбуджана крымінальная справа. Аб гэтым паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта.**

У праваахоўныя органы паступіла паведамленне аб знаходжанні ў лесапаласе паблізу беларуска-польскай граніцы 25-гадовага грамадзяніна Егіпта. Мужчына ляжаў на зямлі ў стане непрытомнасці, пасля аказання першай медыцынскай дапамогі дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне ўстановы аховы здароўя.

Прыйшоўшы ў прытомнасць, мужчына расказаў следчаму аб тым, што на тэрыторыі Польшчы яго разам з сябрамі затрымалі людзі ў форме і выдварылі на тэрыторыю Беларусі з прымяненнем гвалту. Тое, што адбылося, памятае невыразна, паколькі адчуваў сябе дрэнна і прасіў мужчын выклікаць медыкаў, аднак атрымаў адмову, пасля чаго страціў прытомнасць.

У рамках крымінальнай справы дапытаны лечачы ўрач пацярпелага, які растлумачыў, што мужчына дастаўлены ў цяжкім стане з яўнымі прыкметамі пераахаладжэння, што было вельмі небяспечным для яго жыцця і здароўя. Прамаруджванне ў шпіталізацыі хоць бы на гадзіну магло прывесці да лятальнага канца.

Па гэтым факце Гродзенскім міжраённым аддзелам Следчага камітэта ўзбуджана крымінальная справа па ч. 3 арт. 159 (наўмыснае пакіданне ў небяспецы) Крымінальнага кодэкса Беларусі. Праводзіцца расследаванне.

**Пётр ДУНЬКО.**

• У тэму

### СПРОБЫ ПАТУШЫЦЬ ПАЖАР БЕНЗІНАМ

Вырашаць праблему міграцыйнага крызісу можна толькі сумеснымі намаганнямі сілавых ведамстваў, але еўрапейцы да гэтага не гатовыя. Такое меркаванне ў эфіры «Альфа Радыё» выказаў палітолаг Аляксей Дзермант.

«Нядаўна з'явілася навіна аб тым, што ў Германіі былі затрыманыя каля 200 мігрантаў. Хутчэй за ўсё, з паўночнага маршруту: праз Літву і Польшчу да Германіі. Гэта азначае, што, нягледзячы на жаданьі дзеянні ўлад гэтых дзяржаў ЕС, усё роўна яны не могуць перакрыць міграцыйны паток, — адзначыў эксперт і параўнаў меры Польшчы і Літвы па стрымліванні крызісу на граніцы са спробамі патушыць пажар бензінам. — Гэты крызіс так не вырашыш. Будзе павялічвацца колькасць ахвяр, і пакуль яна не вырасце да дзясяткаў чалавек, еўрапейскія чыноўнікі нават не пачухаюцца нешта рэальна зрабіць».

Па словах Аляксея Дзерманта, праблема мігрантаў патрабуе сістэмнага рашэння і супрацоўніцтва ўсіх памежных дзяржаў. «Польшча і Літва з-за палітычных прычын адмаўляюцца супрацоўнічаць з Беларуссю, а Беларусь адна не ў стане справіцца з міграцыйным патокам. Што б там ні казалі пра ўдзел Беларусі ў гэтым крызісе, зразумейце: адна дзяржава не можа арганізаваць з Блізкага Усходу транзіт на сваю тэрыторыю, а пасля адправіць бежанцаў на Захад. Абвінавачванні ў адрас Беларусі проста смешныя ў гэтым плане, — упэўнены аналітык. — Дзейнічае адладжаная транснацыянальная сетка. Мы ў нейкі момант сталі пунктам прыцягнення. Інфраструктура па прыёме мігрантаў створана і ў Літве, і ў Польшчы, і ў Германіі. Гэта велізарны бізнес, які прыносіць вялікія грошы». Гаворачы аб санкцыйным ціску Захаду на Беларусь, Аляксей Дзермант выказаў перакананасць, што ўсе санкцыі б'юць бумерангам па тых, хто іх увёў.

Рэха падзеі

# «БЕЛАРУСЬ — ТАЯ КРАІНА, КУДЫ ХОЧАЦЦА ВЯРНУЦЦА»

## Удзельнікі сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2021» падзяліліся сваімі ўражаннямі

**Галоўны іспыт двухгоддзя для беларускіх і расійскіх вайскоўцаў ужо стаў гісторыяй. Упершыню разам з імі баявую падрыхтоўку ўдасканальвалі і прадстаўнікі Узброеных Сіл Казахстана. Нягледзячы на тое, што канчатковая ацэнка сумеснаму стратэгічнаму вучэнню «Захад-2021» будзе дадзена пасля яго дэталёвага разбору вышэйшым ваенным камандаваннем, папярэдні вынік сведчыць аб тым, што ваеннаслужачыя, пачынаючы ад радавога і заканчваючы генераламі, выканалі пастаўленыя задачы на высокім узроўні.**

Карэспандэнты «Звязды» высветлілі, як самі ўдзельнікі вучэння ацэньваюць сваю работу, наколькі каштоўным для іх быў такі вопыт і чым запомніліся манеўры, якія толькі на тэрыторыі нашай краіны ажыццяўляліся на чатырох палігонах — Абуз-Лясноўскім, Брэсцкім, Даманаўскім і Ружанскім.

**Ваеннаслужачы сіл спецыяльных аперацый капітан Андрэй УРУБЛЕЎСКІ (Беларусь):**



— Сярод задач, якія мы выконвалі падчас вучэння, найбольш запомнілася начное дэсантаванне. Гэта была мая чацвёртая спроба. Апошняе дэсантаванне адрознівалася ад папярэдніх сваёй масавасцю. Скачкі з перыядычнасцю ў 30 секунд ажыццяўляліся з двух ваенна-транспартных самалётаў Іл-76МД. Гэта складаны этап, бо з парашутам адначасова выкідваецца вялікая колькасць дэсантнікаў. Да яго неабходна рыхтавацца. Трэба ажыццявіць як мінімум адно дэсантаванне з гэтага самалёта і як мінімум адно начное з верталёта Мі-8. Падчас вучэння пляцоўка, куды мы прызямляліся, не падсвятлялася, прагледжваліся толькі яе габарыты — для таго, каб пілоты лятальных апаратаў бачылі, куды накіроўваць вайскоўцаў. Складанасць начнога дэсантавання ў тым, што ваеннаслужачы не бачыць, куды ён прызямляецца, адпаведна, не можа вызначыць і таго, калі ў яго адбудзецца кантакт з зямлёй. У мяне за плячыма — звыш 20 скачкоў, але справіцца з пастаўленай задачай было нялёгка, хоць вышыня штатная — 600 метраў, а палёт, як гэта часта бывае, працягваўся тры хвіліны. Дэсантаванне разам з намі ажыццяўлялі вайскоўцы з Казахстана і Расіі. З апошняй у нас Саюзная дзяржава. Мы — стратэгічныя саюзнікі, а значыць, павінны разумець адзін аднаго з паўслова. Дасягнуць гэтага можна толькі правядзеннем вялікай колькасці сумесных трэніровак.

**Старшы афіцэр 2-й гаўбічнай батарэі старшы лейтэнант Яўген ЗАЛІЛАЎ (Расія):**



— Самым складаным падчас выканання задач вучэння для мяне з'яўлялася падтрыманне інтэнсіўнасці агню. Расход боепрыпасаў каласальны! Калі супаставіць з вучэннем «Шчыт Саюза» 2019 года, цяпер ён быў у паўтара раза большы. Дзеянні нашых падраздзяленняў камандаванне ацаніла на найвышэйшую ацэнку. Мы паказалі дакладнасць вядзення агню, яго інтэнсіўнасць. Я ўпершыню ў вашай краіне. Беларусы адрозніваюцца прыязнасцю, прастатой характару. Я быў уражаны чысцінёй вашых гарадоў. Беларусь — тая краіна, куды хочацца вярнуцца, што я абавязкова зраблю ўжо па-за службай.

**Гвардыі старшы сяржант 35-й дэсантна-штурмавой брыгады Серыкбек БАЛТЫМБАЕЎ (Казахстан):**



— Тактычныя дзеянні, а таксама начное дэсантаванне мы адпрацоўвалі пры шчыльным узаемадзеянні з беларускімі вайскоўцамі. Ніякіх моўных бар'ераў не было: мы размаўлялі на нашай багатай рускай мове. Не ўзнікала непаразуменняў і пры выкананні баявых задач. У Беларусі я ўпершыню. Вялікае ўражанне засталося пасля экскурсіі па Брэсцкай крэпасці. Мы вывучалі гісторыю цытадэлі, чыталі пра яе герояў у кнігах, аднак убачыць усё на свае вочы — зусім іншая справа. Як толькі мы зайшлі ў Брэсцкую крэпасць, было такое адчуванне, што бітва толькі што скончылася. Хачу падзякаваць беларускаму народу за такі цёплы прыём. Па прыездзе ў Казахстан мы абавязкова раскажам сваім блізкім, якія вы гасцінныя і шчырыя.

**Ваеннаслужачы сіл спецыяльных аперацый Віталь МАРТЫНКОЎ (Беларусь):**



— Самая галоўная задача, якая стаяла на вучэнні, — арганізаваць узаемадзеянне паміж краінамі, каб мы сумесна маглі папярэдзіць любое ўзброенае нападзенне з боку іншых дзяржаў. Гэта было нескладана: беларусы і расіяне, а таксама казахстанцы, як паказалі манеўры, разумеюць адзін аднаго нават без слоў. За гэты час мы не толькі навучыліся зладжана рэагаваць на любыя сітуацыі на полі бою, але паспелі і пасябраваць адзін з адным. Становіцца сумна, што вучэнне скончылася і нам даводзіцца раз'язджацца.

**Начальнік артылерыі 104-га дэсантна-штурмавога палка падпалкоўнік Аляксандр АКРУЖНОЎ (Расія):**



— У межах сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2021» падраздзяленні дэсантна-штурмавога палка выканалі задачы па знішчэнні ўмоўнага праціўніка. У ходзе манеўраў адбылося практычнае дэсантаванне асабовага складу і тэхнікі. Дэсантаванне адбылося ў штатным рэжыме. Усе пастаўленыя задачы былі выкананы ў поўным аб'ёме з высокай якасцю і прафесіяналізмам. Вельмі прыемна ўзаемадзейнічаць з беларусамі, з якімі нам па сілах любыя задачы. Вучэнне — карысны вопыт і практычны крок у далейшай дзейнасці. Такія манеўры павінны працягвацца і далей.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

Героі побач

# ПОДЗВІГ ПАДЧАС АДПАЧЫНКУ

## Ваеннаслужачы-дэсантнік атрымаў медаль «За выратаванае жыццё»

**Навіна аб такой высокай узнагародзе, прысвоенай указам Прэзідэнта нашай краіны, заспела камандзіра аддзялення аховы камендацкага ўзвода каманднага пункта роты аховы і абслугоўвання 38-й асобнай дэсантна-штурмавой брыгады на палігоне «Брэсцкі». Акурат у гэты час сяржант кантрактнай службы адпрацоўваў задачы, пастаўленыя падчас сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2021».**

— Удзельнічаць у такой маштабнай армейскай падзеі — гонар для кожнага салдата, — мяркуе Ілья Кобак. — Мы на практыцы адпрацавалі тыя дзеянні, якія, не дай бог, нам давядзецца выконваць падчас рэальнага ваеннага супрацiўлення. Акрамя таго, падчас вучэння мы па-сапраўднаму адчулі, што такое ўзаемадзеянне: гэта вельмі важна — разлічваць на дапамогу свайго баявога таварыша. Што датычыцца нашых братоў-расіян, то гэта такія ж вайскоўцы, як і мы: яны прафесіяналы, а яшчэ — вельмі прыстойныя і сумленныя людзі, якія, калі спатрэбіцца, абавязкова працягнуць руку дапамогі.



**Ілья КОБАК падчас вучэння «Захад-2021».**

Аб тым, наколькі гэта важна — дапамагаць і адгукацца на чужую бяду, малады чалавек ведае не па чутках. Зімой ён увarваўся ў ахопленую полымем хату і вынес адтуль пажылую жанчыну. Ні разу за гэтыя лічаныя хвіліны Ілья не падумаў пра ўласнае жыццё. І абсалютна няважна, што пацярпелая з'яўляецца вайскоўцу прабабуляй. Не задумваючыся, ён паўтарыў бы свой учынак і цяпер, чыя б хата ні гарэла.

— У тую раніцу мы дамовіліся з сябрам паехаць у горад: нам патрэбна было набыць будаўнічыя матэрыялы, — успамінае першы дзень лютага Ілья Кобак. — Я прыйшоў у прызначанае месца, як раптам ён патэлефанаваў і сказаў, што зламаўся аўтобус. Мы перанеслі нашу сустрэчу на больш позні час. Я вырашыў пачакаць сябра дома і рушыў у бок сваёй хаты. Па дарозе ўбачыў, што аднекуль ідзе моцны дым. Падбег бліжэй і зразумеў, што адкрытым полымем гарыць дом маёй прабабулі.

Не ўбачыўшы нікога каля хаты, малады чалавек зразумеў, што яго 90-гадовая сваячка засталася ўнутры. Не раздумваючы, ён выбіў акно (уваходныя дзверы ўжо былі ахоплены полымем) і трапіў у дом. Схапіў сваю прабабулю, якая моцна спала і нават не здагадвалася аб тым, што адбываецца навокал, і вынес яе з хаты. Ніхто з іх не пацярпеў. Каб не атруціцца ўгарным газам, Ілья абкруціў твар мокрай анучай, якую перад гэтым патрымаў у снезе, — не дарма прайшла армейская навука.

Гэтая драма разыгралася на пачатку лютага ў вёсцы Масевічы, што ў Малярыцкім раёне. Што стала прычынай пажару, праваахоўнікі высвятляюць дагэтуль. Адно было зразумела амаль адразу — сярод аднавяскоўцаў з'явіўся герой. Аднак сам Ілья так не лічыць. Па словах вайскоўца, гэтак жа паступіў бы кожны на яго месцы.

Відаць, так распарадзіўся лёс, што менавіта ў гэты час, калі магла здарыцца трагедыя, Ілью адпусцілі ў адпачынак — у 38-й асобнай дэсантна-штурмавой брыгадзе ён акурат служыў тэрміновую службу. Не адбыўшы яе да канца, перавёўся на кантрактную. Малады чалавек удзячны свайму дзядзьку-мараку, які параіў звязаць сваё жыццё з войскам. Пра гэта Ілья Кобак, уладальнік высокай узнагароды Прэзідэнта, нікольк і не шкадуе.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва героя публікацыі.**



**Хата, з якой ваеннаслужачы выратаваў сваю прабабулю.**

Ведай нашых!

# ЭКІПАЖ, ЯКІ СТАЎ СЯМ'ЁЙ

## Як удзельнікі «Танкавага біятлона» спаборнічалі за ўзнагароды і чаму гэта больш чым конкурс?

**Многія беларусы з заміраннем сэрца сачылі за найбольш відовішчным конкурсам VII Армейскіх міжнародных гульняў — «Танкавы біятлон». Упершыню за гісторыю спаборніцтва наша каманда заняла трэцяе месца ў «Індывідуальнай гонцы», саступіўшы ўсяго пяць секундаў танкістам з Расіі. Аднак гэтая «бронза», як і ў мастацкай гімнастыцы, калі першыя дзве прыступкі п'едэстала, за рэдкім выключэннем, займаюць расійскія спартсменкі, даражэйшая за «золата».**



Нашы вайскоўцы ўжо вярнуліся на Радзіму, раз'ехаліся па сваіх воінскіх часцях і прыступілі да ранейшых абавязкаў. Аднак танкісты не страчваюць сувязі адзін з адным — цяпер яны як адна сям'я. І абсалютна няважна, што знаходзяцца ў розных кутках нашай краіны.

Гвардыі лейтэнант Міхаіл Ланкевіч служыць у 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе. Калі падчас Армейскіх міжнародных гульняў ён быў камандзірам танка, то ў рэальным жыцці ваеннаслужачы — камандзір цэлай танкавай роты. У «Танкавым біятлоне» ўдзельнічаў упершыню. Каб трапіць у склад нацыянальнай каманды, прайшоў нялёгкі шлях адбораў. Першы раз малады чалавек спрабаваў свае сілы яшчэ будучы курсантам Ваеннай акадэміі. Тады не хапіла не толькі майстэрства, колькі вопыту. У зборную Беларусі трапіў з трэцяй спробы.

— Прадстаўляць краіну на такіх маштабных міжнародных спаборніцтвах — вялікі гонар і адказнасць, — мяркуе Міхаіл Ланкевіч. — Конкурс складаны не толькі фізічным выкананнем пастаўленых задач. Немалаважна і тое, як маральна настроены члены экіпажа. Ты працуеш не толькі за сябе, але і за ўсю каманду, а гэта вялікая адказнасць.

Вядома, танкісты перажывалі, калі зусім няшмат ім не хапіла для перамогі. Але тыя, хто падтрымліваў беларускі экіпаж на трыбунах, а таксама сачыў за ім у рэжыме «анлайн», бачылі, што нашы танкісты зрабілі ўсё магчымае. А можа, нават больш — прадстаўнікі Узброеных Сіл Беларусі апярэдзілі 30 экіпажаў такіх наймацнейшых армій свету, як Іран, Кітай, Казахстан, Сербія. Гэтым фактам асабліва ганарацца сваякі Міхаіла, якія ў танкавай справе ведаюць толк. Бацька вайскоўца — палкоўнік, танкіст. У танкавых войсках у свой час служылі два дзядулі камандзіра роты. Афіцэрскія пагоны носіць і родны брат Міхаіла.

Старшы механік-кіроўца ўзвода гвардыі яфрэйтар Андрэй Зылевіч, як яго баявы таварыш, звязваць сваё жыццё з арміяй не планаваў. Аднак калі пасля тэрміновай службы яму прапанавалі застацца ў 19-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе па кантракце, малады чалавек, не раздумваючы, пагадзіўся.

У «Танкавым біятлоне» ваеннаслужачы марыў паўдзельнічаць ужо даўно. Атрымалася толькі сёлета. Механік-кіроўца ў дэталях памятае кожны заезд, абдумвае, ці можна было пазбегнуць некаторых памылак. «У фінале нам не пашчасціла з надвор'ем, — расказвае Андрэй. — З-за дажджу траса ператварылася ў суцэльнае балота, што перашкаджала рухацца па зададзеным маршруце».

Кожны з членаў экіпажа дагэтуль памятае цырымонію ўзнагароджання. Вайскоўцам уручылі медалі, памятныя прызы. Праўда, найлепшы падарунак чакаў Андрэя Зылевіча на радзіме — на другі дзень пасля вяртання са спаборніцтва жонка нарадзіла вайскоўцу сына.

Менавіта сын, якому, праўда, ужо 10 гадоў, найбольш падтрымліваў свайго бацьку — камандзіра танкавага ўзвода 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады старшага прапаршчыка Дзяніса Маісеенку. Хоць хваляваўся асабліва не было падстаў. Вайсковец — самы вопытны член экіпажа: у «Танкавым біятлоне» Дзяніс удзельнічаў ужо сёмы раз. А ўсё таму, што найбольш прафесійнага наводчыка танка ў беларускай арміі проста не існуе.

— Вядома, было крыўдна застацца за адзін крок ад перамогі, — пераканаы Дзяніс Маісеенка. — У той жа час мы добра ведаем, што экіпаж добрасумленна выканаў усе пастаўленыя задачы і зрабіў немагчымае — аб гэтым сведчаць нашы сапернікі з іншых краін, якія засталіся ззаду. У любым выпадку мы маем каштоўны вопыт, які нам спатрэбіцца як у будучыні, так і цяпер, у паўсядзённай дзейнасці.



**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яна ГАРБАНЮКА, «Ваяр».**

Векапомнае

# ПАСПЕЦЬ ДА СВІТАННЯ

## Як партызаны за адну ноч знішчылі нямецкі гарнізон

**22 чэрвеня 1943 года, у дзень трагічнай даты пачатку Вялікай Айчыннай вайны, партызаны атрада «Бальшавік» здзейснілі нападзенне на фашысцкі гарнізон у былым саўгасе «Косіна», што на Лагойшчыне...**



Сведка партызанскай аперацыі Ніла МІКУЛІЧ.

### Помста ў навагоднюю ноч

Даваенны саўгас «Косіна» знаходзіўся каля спіртзавода, прыкладна ў кіламетры ад аднайменнай вёскі. Незадоўга да вайны на тэрыторыі саўгаса размясцілі машынна-трактарную станцыю, якая абслугоўвала суседнія калгасы.

З пачаткам акупацыі ў Косіне пачалася барацьба з ворагам. За арганізацыю падпольнай работы супраць акупантаў 15 жніўня 1941 года ў суседняй вёсцы Рудня Смалявіцкага раёна карным атрадам былі расстраляныя сакратар камсамольскай арганізацыі Іван Вітушка, дырэктар Задамлянскай школы Аляксандр Мрочак і дырэктар МТС Сцяпан Рэутовіч. Сям'я апошняга жыла да вайны і падчас акупацыі каля спіртзавода ў былым вытворчым будынку саўгаса, які быў перароблены пад жылы дом.

— Немцы размясціліся ў памешчыцкім доме: там знаходзіліся адміністрацыя, жандармерыя і паліцыя, — расказвае дачка Рэутовіча Ніла Мікуліч. — На спіртзаводзе захоўвалі гародніну. Тэрыторыю ахоўвала паліцыя. Камендантам гарнізона ў Косіне з'яўляўся немец, мы яго звалі Куша. Ён быў тоўсты, жыў у памешчыцкай хаце. Усе яго баяліся...

Партызаны некалькі разоў нападалі на ахову спіртзавода. Аб адной такой аперацыі распавяла жыхарка Косіна Зінаіда Шчурак: «Мы жылі недалёка. Гэта здарылася ўзімку 1942 года, у навагоднюю ноч. Мы сядзелі і глядзелі ў акно. Бачым — адзін за адным у белых халатах ідуць лыжнікі: 20 чалавек налічылі. Помню, як тата сказаў: «Паехалі фрыцаў забіваць». Партызаны ведалі, што немцы будуць сустракаць свята і нап'юцца. Навагодняя ноч для немцаў, якія ахоўвалі завод, скончылася трагічна: усіх іх, акрамя аднаго паліцая, які паспеў уцячы, партызаны парэзалі нажамі». Аднак нямецкі гарнізон працягваў існаваць...

### Разгром гарнізона

Гэты ўмацаваны апорны пункт даўно перашкаджаў партызанам. Акрамя таго, паліцэйскія з косінскага гарнізона наводзілі жах на жыхароў навакольных вёсак. Яны часта хадзілі па хатах, забіралі ў людзей прадукты. Каб засцерагчы сябе ад нападу партызанаў, немцы пабудавалі вакол гарнізона дзоты, у якіх устанавілі кулямёты.

Летам 1943 года камандаванне атрада «Бальшавік» прыняло рашэнне знішчыць нямецкі гарнізон у Косіне. Дзякуючы неабыякавым жыхарам, партызаны даведаліся пра колькасць гарнізона, яго ўзбраенне, асаблівасці нясення ахоўнай службы паліцэйскімі. Па ўспамінах удзельніка аперацыі, былога камісара брыгады «Бальшавік» Мікалая Андрэева, камандаванне атрада вырашыла правесці аперацыю ўначы з дапамогай паліцэйскіх, якія фіктыўна служылі ў косінскім гарнізоне, а працавалі на партызанаў. Прадугледжвалася, што падчас нападзення паліцэйскія будуць стаяць на пастах і па ўмоўным сігнале правядуць штурмавыя групы да дзотаў, знішчыўшы іх, асноўныя сілы атакуюць будынак жандармерыі і паліцыі. Аднак далёка не ўсё ўдалося ажыццявіць...

У Нацыянальным архіве Беларусі захоўваецца справаздача аб разгроме партызанамі атрада «Бальшавік» варожага гарнізона ў Косіне, а таксама схема правядзення дадзенай аперацыі. Дакумент сведчыць: «...У выніку праведзенай аперацыі ў трох дзотах кінжаламі было выразана 18 паліцэйскіх і два жандармы раёна. Узятыя трафеі — 17 вінтовак, ручны кулямёт, 25 гранат, 4000 штук патронаў... Вызначыліся ў аперацыі па разгроме варожага гарнізона «Косіна»: камандзір узвода Васіль Каліцін, які без шуму, з адным выстралам і кінжалам выразаў каравул дзота ў колькасці 6 чалавек... Камандзір узвода Назараў на ўпор у дзоце расстраляў чатырох паліцэйскіх, двух узяў у палон. Федзя Машкоў узяў нямецкі кулямёт і сам расстрэльваў паліцыю... За кароткую ноч не здолелі ўзяць два дзоты. Аперацыя прайшла паспяхова. З боку партызан страт няма...»

Тую ноч не можа забыць жыхарка Лагойска Ірына Надольская, якая ў вайну была зусім невялікая. «Стралялі так, што мы клаліся на падлогу, — расказвае сведка. — Да адных у хату праз сцяну ўляцела куля — забіла мясцовую дзяўчыну Маню Свянціцкую. Немцы ўцяклі ў Лагойск. Забітых паліцаяў у Косіне не хавалі...»

Важную ролю ў падрыхтоўцы аперацыі адыгрываў камсамолец з Панізоўя Дзмітрый Яцкевіч, які, па заданні падпольнага райкама, служыў у лагойскай паліцыі. Ён сігналізаваў партызанам, калі можна выходзіць на зыходныя пазіцыі, вёў штурмавыя групы да варожых дзотаў. Пасля разгрому косінскага гарнізона ўсе ўдзельнікі аперацыі, якія ўмоўна працавалі на немцаў, пайшлі з партызанамі. Дзмітрый Яцкевіч змагаўся ў атрадзе «Бальшавік» да канца вайны, быў прадстаўлены да ўзнагароды.

У сваіх успамінах Мікалай Андрэеў расказвае аб тым, што ў пэўны момант падзеі пайшлі не па плане. Пачуўшы стральбу, немцы выявілі наступленне партызанаў і арганізавалі абарону ва ўмацаваннях каля будынкаў цэнтральнай сядзібы маёнтка. Да світання заставалася мала часу — пачало віднець. Таму калі адразу да канца разграміць гарнізон не атрымалася і стала зразумела, што бой зацягнецца, партызаны далі каманду адыходзіць у бок вёскі Свідна. Захапіўшы трафеі і прадукты, яны без страт пакінулі нямецкі гарнізон.

Так быў разгромлены яшчэ адзін умацаваны пункт ворага. Нападзенне на Косіна паказала сілу і магчымасці партызанаў: акупанты больш не адчувалі сябе ў бяспецы нават у добра ўмацаваных гарнізонах.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

### ЛОТЫ №№ 1–6 – МАШИНО-МЕСТА

**Местоположение: г. Минск, ул. Авакяна, 19**

| Лот № | Инвентарн. номер | Общая площадь | Адрес (№ дома/пом.) | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | | |
| **1** | 500/D-708120455 | 32,1 кв. м | **19-348** | **42 336,00** |
| **2** | 500/D-708120477 | 13,2 кв. м | **19-374** | **17 568,00** |
| **3** | 500/D-708120473 | 13,2 кв. м | **19-370** | **17 568,00** |
| **4** | 500/D-708120446 | 30,1 кв. м | **19-332** | **39 648,00** |
| **5** | 500/D-708120478 | 13,2 кв. м | **19-375** | **17 568,00** |
| **6** | 500/D-708120471 | 13,7 кв. м | **19-368** | **18 240,00** |

**Лот № 7 – транспортное средство, бывшее в эксплуатации**

Местоположение:
**Витебская обл., г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 37А**

| | |
|---|---|
| **Автомобиль «RENAULT MASTER», грузовой вагон**, цвет – белый, номер кузова VF1MAF4CF50251531, г. в. 2014 | **37 747,39** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих** дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Передача предмета аукциона победителю торгов (единственному участнику), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости имущества.
Победителю торгов (единственному участнику) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины; с государственной регистрацией автомобиля несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – в 11.00 29.10.2021. Окончание торгов – в 12.00 29.10.2021.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.10.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Трест Белсантехмонтаж № 1», г. Минск, ул. Я. Коласа, 23, к. 1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв. м | Адрес | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Складское помещение № 8Н (расположено в подвале) | 500/D-695622 | 36,5 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 23, корп. 1, пом. 8Н | 247 200,00 |
| | Складское помещение № 11Н | 500/D-70784559 | 43,5 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, 23/1-11Н | |
| 2 | Складское помещение № 9Н (расположено в подвале). Обременение: аренда | 500/D-695623 | 59,5 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, 23/1-9Н | 222 000,00 |
| 3 | Складское помещение № 7Н (расположено в подвале) | 500/D-695621 | 37,2 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 23, корп. 1, пом. 7Н | 132 000,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.10.2021 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **22.10.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению учреждения здравоохранения
«Вилейская центральная районная больница» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ с инв. № 631/D-12862

(назначение – помещение здравоохранения, наименование – Кузьмичский фельдшерско-акушерский пункт),
**общей площадью 37,9 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Вилейский район, Любанский с/с, д. Кузьмичи, сведения о земельном участке: кадастровый номер 621384607601000054, площадь 0,2059 га, право общей долевой аренды**

Начальная цена без НДС – **6 650,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **665,00** бел. руб. *(Начальная цена снижена на 50 %).*

**Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Условия**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 12.08.2021.

Аукцион состоится **13.10.2021 г.** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.10.2021 г.** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра: 8 (01771) 56 837, 8 (033) 668 68 95.**

УНН 600011127

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» объявляет о проведении электронных торгов 2021.Ч.002.00034 по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец** Открытое акционерное общество «Автомобильная транспортно-экспедиционная компания» г. Витебск, тел. +375 (212) 55-32-72.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов:** 26.10.2021 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9 1320-031, 2011 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9B0001312, цвет – зеленый, рег. знак АЕ 6735-2.
**Нач. цена:** 19 500,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1 950,00 бел. руб.
**Лот № 2.** Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9-1320-031, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9A0000423, цвет – темно-зеленый, рег. знак АЕ 4301-2.
**Нач. цена**: 17 600,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1760,00 бел. руб.
**Лот № 3.** Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9-1320-031, 2010 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9A0000412, цвет – темно-красный, рег. знак АЕ 4175-2.
**Нач. цена**: 16 400,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1640,00 бел. руб.
**Лот № 4.** Грузовой седельный тягач MAZ-5440A9 1320-031, 2011 г. в., кузов (рама) № Y3M5440A9B0001532, цвет – красный, рег. знак АЕ 6734-2.
**Нач. цена**: 13 900,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1390,00 бел. руб.
**Лот № 5.** Полуприцеп бортовой тентовый MAZ 975830-3018, 2011 г. в., кузов (рама) № Y3M975830B0004660, цвет – черно-серебристый, рег. знак А 3559 А-2.
**Нач. цена**: 10 800,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1 080,00 бел. руб.
**Лот № 6.** Грузовой седельный тягач МАЗ 5432 А5-323, 2008 г. в., кузов (рама) № Y3M5432A580000379, цвет – белый, рег. знак АВ 3111-2.
**Нач. цена**: 12 700,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1 270,00 бел. руб.
**Лот № 7.** Грузовой седельный тягач МАЗ 5432 А5-323, 2008 г. в., кузов (рама) № Y3M5432A580000366, цвет – белый, рег. знак АВ 2416-2.
**Нач. цена:** 12 200,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1 220,00 бел. руб.
**Местонахождение имущества:** г. Витебск, ул. Терешковой, 11

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах в порядке, размещенном на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 25.10.2021.** Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г.Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов:** победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 10 календарных дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, возместить затраты по оценке предмета электронных торгов, оплатить услугу по размещению одного аукциона и обслуживанию ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 календарных дней со дня проведения электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение электронных торгов, затрат по оценке, услуг по ЭТП; оплатить НДС сверх цены продажи предмета электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, предусмотренные договором купли-продажи. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе: «Транспорт». Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 649-62-46.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ* ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

### ОАО «УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ ХОЛДИНГА «ГРОДНООБЛСЕЛЬХОЗТЕХНИКА»

| Предмет торгов | Начальная цена с учетом НДС, руб. | Сумма задатка (1 %), руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2008 г. в., зав. № 2310060, рег. № СК-4 2832 | 62 520,00 | 625,00 |
| **Лот № 2 – Свеклоуборочный комбайн HOLMER Terra Dos T2,** 2005 г. в., зав. № 192805, рег. № б/н | 122 400,00 | 1 224,00 |
| **Лот № 3 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2006 г. в., зав. № 2210049, рег. № СК-4 2824 | 60 827,46 | 608,00 |
| **Лот № 4 – Свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2,** 2007 г. в., зав. № 2310082, рег. № СК-4 2810 | 51 309,02 | 513,00 |

**Местонахождение имущества:** Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Рожанка (ОАО «Щучинский ремонтный завод»)

**Сведения о продавце:** ОАО «Управляющая компания холдинга «ГродноОблсельхозтехника», г. Гродно, ул. Лермонтова, 2, тел. 8 (0152) 626024

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906

**Торги состоятся 11 октября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | **по 05 октября 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** |

Аукцион без условий. Шаг аукциона 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней с момента проведения аукциона.

**Условия оплаты:** 100 % предоплата. Условия участия и порядок проведения аукциона по тел. 8 (0152) 621632 и на сайте www.fincentr.by.

Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00, ответственное лицо:
Болдовский Алексей Геннадьевич, тел. в г. Гродно 8 (0152) 626020, 626024.
Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 16.06.21 г., 17.07.21 г., 29.07.21 г., 11.08.2021 г., 24.08.2021 г., 09.09.2021 г.

** – Понижение цены, но не ниже рыночной стоимости по лотам №№ 1–2, не ниже остаточной стоимости по лотам №№ 3–4 с учетом НДС.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

### ОАО «ГРОНИТЕКС»

| | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| **Предмет торгов, краткая характеристика** | **Капитальное строение, инв. № 400/U-84094** (незавершенное законсервированное капитальное строение), общей площадью 90,4 кв. м, железобетонное, готовность строения – 69 % | **Капитальное строение, инв. № 400/U-84093** (незавершенное законсервированное капитальное строение), общей площадью 1060,9 кв. м, железобетонное, готовность строения – 75 % |
| | В зданиях отсутствуют: отопление, водопровод, канализация, электромонтажные работы, отделка, проемы. Консервация – 2013 г. | |
| **Информация о земельном участке** | кадастровый номер 440100000002010139, площадь – 0,0221 га, право аренды по 07.02.2070 г. | кадастровый номер 440100000002010103, площадь – 0,1655 га, право аренды по 23.01.2070 г. |
| | Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. М. Горького, 91. Здания расположены на территории СЭЗ «ГродноИнвест». На данной территории возможно размещение производственной застройки с учетом ограничений, предъявляемых регламентами генерального плана г. Гродно | |

| **Начальная цена с учетом НДС** | **18 840,00 рублей** | Задаток (10 %) – 1 884,00 руб. | **212 400,00 рублей** | Задаток (10 %) – 21 240,00 руб. |
|---|---|---|---|---|

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | ОАО «Гронитекс», г. Гродно, ул. Горького, 91, тел./факс 8 (0152) 431046 |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X, УНП 500481906 |

Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 календарных дней после проведения торгов, условия оплаты – в течение 30 календарных дней с даты заключения договора

**Торги состоятся 25 октября 2021 года в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| **Срок подачи документов** | **По 19 октября 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** |

**Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by.
Тел. для справок 8 (0152) 621632**

## ООО «Вельми Смачна»

**информирует покупателей (потребителей)**

## ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ВОЗВРАТА

**печенья затяжного «Маричка», весового, изготовленного ЗАО «Житомирские ласощи» (Украина, г. Житомир).**

Возврат можно осуществить в месте приобретения продукции или по адресу: ООО «Вельми Смачна», г. Минск, Логойский тр-т, д. 37, пом. 7, оф. 19.

УНП 192955293

# «На ШВЛ вакцынаваных няма»


Фота zelwa.by.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

**Уладзімір Каранік:** Мы здзіўлены, што ў грамадстве ўзніклі такія дэбаты аб неабходнасці вакцынацыі. З майго пункту погляду гэта пытанне вырашана дастаткова даўно: першаму задакументаванаму выпадку вакцынацыі больш за 225 гадоў, і за гэты час асноўныя кропкі над «і» ўжо расстаўленыя. Паводле вызначэння СААЗ, вакцынацыя — гэта просты, бяспечны, эфектыўны спосаб барацьбы з хваробамі да моманту сустрэчы чалавека з узбуджальнікам. Яшчэ да пандэміі, па статыстыцы СААЗ, штогод вакцынацыя выратоўвала ад двух да трох мільёнаў жыццяў. Пры гэтым Беларусь не ўнікальная — скептыкі ў адносінах да вакцынацыі ёсць у любой краіне. Таму ў 2019 годзе СААЗ пытанне негатыўнага стаўлення да вакцынацыі ўключыла ў спіс 10 галоўных праблем, над якімі працуе.

**Ігар Карпаў:** Хачу звярнуць увагу, што папярэдзіць цяжкае цячэнне хваробы з дапамогай вакцынацыі нашмат прасцей, чым аказваць дапамогу тым арсеналам сродкаў, якія цяпер маюцца.

***— Чаму ў паліклініках толькі расійская і кітайская вакцыны і няма іншых?***

**У. Каранік:** На сёння гэта тыя вакцыны, якія зарэгістраваныя і даступныя ў Беларусі. Вытворчасць «Спадарожніка V» наладжана ў нашай краіне. Улічваючы сяброўскія адносіны з Кітаем, ёсць магчымасць пры вострым дэфіцыце вакцын у свеце набываць кітайскую. Для таго каб забяспечыць даступнасць вакцынацыі ўсім, хто мае патрэбу, праводзіцца работа па закупцы і вытворчасці гэтых вакцын. Для рэгістрацыі вакцыны павінен быць зварот вытворцы. Наколькі я разумею, Pfizer і астатнія да нас не звярталіся, бо яны маюць сур'ёзную праблему з задавальненнем наяўнага попыту ў свеце.

***— Чаму пасля прымянення вакцын людзі заражаюцца і хварэюць?***

**І. Карпаў:** У першую чаргу вакцына выкарыстоўваецца для таго, каб аслабіць цячэнне захворвання, каб не даводзіць яго да цяжкай формы. І з гэтым вакцынацыя вельмі і вельмі нядрэнна справілася. Так, сапраўды, бываюць выпадкі захворванняў, але калі мы пачынаем аналізаваць, то гэта ў асноўным ці лёгкае цячэнне, ці сярэднецяжкае. Многія людзі проста пераносяць хваробу, не звяртаючы ўвагі і думаючы, што гэта звычайная ВРВІ. Вакцынуючы грамадзян, мы перш за ўсё клапоцімся пра тое, каб цячэнне было максімальна няцяжкім. Пераконваючы старэйшае пакаленне ў неабходнасці вакцынацыі, мы зберажаце найбольш уразлівы кантынгент, — гэта вельмі важная справа кожнай сям'і.

Яшчэ адзін істотны момант: большасць людзей, якія захварэлі, заразіліся ад асоб, што не мелі сімптомаў захворвання. Гэта трэба памятаць. Апошнія дні перад пачаткам клінічнай карціны з'яўляюцца вельмі небяспечнымі ў плане перадачы віруса.

**У. Каранік:** Згодна з публікацыямі, эфектыўнасць «Спадарожніка V» супраць развіцця хваробы па розных даных дасягае ад 88 да 97 %. Ад цяжкіх формаў захворвання — 95—99 %, а па некаторых даных — да 100 %. У нас яшчэ не татальная вакцынацыя, таму людзі хварэюць: як вакцынаваныя, так і невакцынаваныя. А калі ўзяць параўнальную статыстыку, якую мы збіралі на мінулы тыдзень, то сярод тых, хто праходзіць стацыянарнае лячэнне па COVID-інфекцыі (гэта сярэднецяжкая і цяжкая формы захворвання), вакцынаваных усяго 3,3 %. А 97 % — гэта невакцынаваныя. Сярод тых, хто знаходзіцца ў аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі, вакцынаваных 3 %. На ШВЛ вакцынаваных няма ніводнага. Гэта паказчык таго, што вакцынацыя абараняе.

***— Як пракаментуеце вопыт Ізраіля, дзе ў бальніцах шмат вакцынаваных? Чаму вакцына не дапамагла, а толькі пагоршыла сітуацыю?***

**У. Каранік:** Вакцына не пагоршыла сітуацыю. Па-першае, у Ізраілі вакцынавана не ўсё насельніцтва. Былі арганізаваныя групы, у тым ліку артадаксальныя яўрэі, якія адмаўляліся вакцынавацца. І менавіта сярод іх большы працэнт цяжкіх формаў. Па-другое, калі параўнаць статыстыку Ізраіля з іншымі краінамі, у іх аб'ектыўна меншы працэнт менавіта цяжкіх формаў і лятальных зыходаў. А калі паглядзець вопыт Сан-Марына, дзе 100-працэнтная вакцынацыя, прычым «Спадарожнікам», то апошні лятальны зыход ад каранавіруснай інфекцыі там быў 26 красавіка. Так, выпадкі заражэння бываюць, бо імунная сістэма рэагуе не заўсёды эфектыўна.

**І. Карпаў:** Трэба згадаць, каго перш за ўсё прышчаплялі ў Ізраілі, — пажылых пацыентаў. Згодна са статыстыкай, у 90-гадовых людзей верагоднасць трапіць у стацыянар з цяжкім цячэннем у тысячу разоў большая, чым у 40-гадовых. І вакцына нівеліравала гэту праблему. Так, хварэе шмат людзей, сярод іх і вакцынаваныя. Але форма хваробы адрозніваецца.

***— Паважаныя медыкі, у вас не выклікае падазрэнняў той факт, што чалавецтва ва ўсім свеце прыходзіцца ўгаворваць зрабіць укол выратавальнай вакцынай?***

**У. Каранік:** Пэўнае здзіўленне ў нас гэта выклікае. Але гэта характэрна не толькі для нашай краіны. Мы бачым па паведамленнях з іншых краін, што ўгаворваць даводзіцца і іх грамадзян.

Ёсць шмат пытанняў, быццам бы вектарная, або ДНК-мадыфікаваная, вакцына ўбудоўваецца ў ДНК чалавека. Дык вось, яна не ўбудоўваецца ў геном чалавека! Гэта значыць, што быў мадыфікаваны геном адэнавіруса. Яго мадыфікавалі, каб, па-першае, ён не ўбудоўваўся ў геном чалавека, па-другое, каб ён некантраляванa не размнажаўся ў арганізме. Але пры гэтым ён прадуцыруе S-бялок, на які выпрацоўваюцца антыцелы. І пры сустрэчы з каранавірусам імунітэт рэагуе і перашкаджае яму пранікаць у клеткі. Гэта не той носьбіт, які надоўга затрымліваецца ў арганізме і ўбудоўваецца ў геном чалавека. Вакцына не прыводзіць да аддаленых наступстваў, звязаных з парушэннем геному чалавека, не прыводзіць да стэрыльнасці.

***— Як каранавірус уплывае на рэпрадуктыўную сістэму?***

**Людміла Кеда:** Калі казаць пра вакцынацыю, то даказана, што яна не ўплывае на рэпрадуктыўную сістэму як жанчын, так і мужчын. Сам каранавірус можа ўплываць, хоць на сёння яшчэ даследаванняў не праведзена, бо гэта даволі новая інфекцыя. Але яны вядуцца.

***— Ці можа вакцынацыя прыводзіць да бясплоддзя?***

**Л. Кеда:** Не можа, тут няма ніякай сувязі.

***— Ці не з'яўляецца бранхіяльная астма супрацьпаказаннем да вакцынацыі?***

**І. Карпаў:** Не з'яўляецца. Наадварот, пацыенты з бранхіяльнай астмай і хранічнай абструктыўнай хваробай лёгкіх мусяць абавязкова вакцынавацца.

***— Ці прышчапляюць цяжарных ад COVID?***

**Л. Кеда:** На сёння цяжарных не прышчапляюць. У вакцынах, якія маюцца ў нас, паказана, што цяжарнасць і перыяд груднога кармлення з'яўляюцца супрацьпаказаннямі для вакцынацыі. Пакуль не праведзена дастаткова даследаванняў, якія б сведчылі, што цяжарных можна прышчапляць. Хоць, трэба адзначыць, што цяжарнасць можа прыводзіць да больш цяжкага цячэння COVID-19, асабліва з ростам тэрміну цяжарнасці. Таму ў дадзенай сітуацыі ахова ў цяжарных павінна быць, у першую чаргу, тымі вядомымі сродкамі, якія мы выкарыстоўваем: масачны рэжым, сацыяльнае дыстанцыяванне, паменш знаходзіцца ў грамадскіх месцах.

**І. Карпаў:** Былі такія выпадкі, у тым ліку ў Расіі, калі жанчына не ведала пра сваю цяжарнасць і была прышчэплена. І ўплыву вакцынацыі на плод не было. Шмат краін цяпер імкнецца рабіць жанчынам прышчэпку ад COVID-19 на апошнім трыместры цяжарнасці.

**У. Каранік:** Трэба растлумачыць: каб прэпарат быў дазволены цяжарным жанчынам і дзецям да 12 гадоў, павінны праводзіцца вельмі сур'ёзныя клінічныя даследаванні. Доступ прэпаратаў да гэтых катэгорый, бадай, самы жорсткі. Паколькі няма дастатковага клінічнага вопыту, то гэта паказанне пакуль адсутнічае. Але досвед назапашваецца, і некаторыя краіны дапускаюць вакцыны для выкарыстання ў дзяцей з 12 гадоў і нават з 5 да 12 гадоў.

***— Чаму «Спадарожнік» актыўна прымяняецца пры тым, што ён яшчэ праходзіць даследаванні, пра што паведамляецца на афіцыйным сайце?***

**У. Каранік:** Трэба разумець, што клінічныя выпрабаванні ўсіх прэпаратаў дзеляцца на некалькі фаз. Першая праводзіцца на здаровых добраахвотніках, другая — на тых, хто мае паказанні да выкарыстання таго ці іншага сродку, трэцяя праводзіцца перад рэгістрацыяй. Потым пачынаюцца паслярэгістрацыйныя даследаванні. Колькі б прэпарат ні выкарыстоўваўся, перыядычна праводзяцца яго выпрабаванні на бяспеку і эфектыўнасць у параўнанні з іншымі сродкамі. Дык вось на сёння першая, другая і трэцяя фазы выпрабаванняў па «Спадарожніку» праведзены. Цяпер ідуць пострэгістрацыйныя клінічныя выпрабаванні. Гэта не значыць, што прэпарат не прайшоў усіх працэдур допуску для бяспечнага прымянення.

***— Каму паказана рэвакцынацыя?***

І. Карпаў: Ёсць тыя, у каго не выпрацоўваецца імунітэт, іх 7-8 %. Гэта людзі з імунадэпрэсіяй, у тым ліку ўзроставай, асобы, у якіх ёсць верагоднасць цяжкага цячэння хваробы. У такіх выпадках трэцяя вакцынацыя, або бустэрная, паказана. Аднак тут трэба ўсведамляць, што нізкі ўзровень антыцел неабавязкова азначае адсутнасць імунітэту.

***— Чаму пункты вакцынацыі адкрываюцца ў гандлёвых цэнтрах, чыгуначных і аўтавакзалах, дзе не выконваюцца неабходныя патрабаванні?***

**Л. Кеда:** Ва ўсіх нашых цэнтрах выконваюцца санітарныя меры. Акрамя таго, у абавязковым парадку праводзіцца агляд пацыента ўрачом. Гэтыя пункты адкрываюцца для таго, каб чалавеку было зручна, прыйшоўшы ў гандлёвы цэнтр, вакцынавацца.

**У. Каранік:** Толькі ў нашай краіне больш за 1,5 мільёна прышчэпленых, гэта значны клінічны вопыт. Алергічных рэакцый няма. У нас ніводнай рэакцыі, якая прывяла б да лятальнага зыходу ці патрабавала б працяглай шпіталізацыі, не было.

***— Ці праўда, што пасля прышчэпкі высокі ўзровень развіцця інфаркту міякарда?***

**І. Карпаў:** Не.

**У. Каранік:** У пацыентаў, інфіцыраваных COVID-19, і пасля хваробы з-за парушэння сістэм мікрацыркуляцыі і згусання крыві ёсць даныя пра такую імавернасць.

***— Ці ўплывае прышчэпка на патэнцыю ў мужчын?***

**У. Каранік:** Не ўплывае.

***— Пасля якой з вакцын лепшы імунітэт?***

**І. Карпаў:** Лічбы гэтыя маюцца ў адкрытым доступе. «Спадарожнік» з'яўляецца адной з найбольш імунагенных вакцын. Калі з'явіўся дэльта-вірус, ва ўсіх вакцын некалькі знізіўся працэнт клінічнага эфекту. Маецца на ўвазе не прафілактыка цяжкага ходу хваробы, а прафілактыка захворвання. У «Спадарожніка V» гэты паказчык застаецца на ўзроўні пад 85 %. Гэта высокі паказчык, такім прынята лічыць эфект, вышэйшы за 70 %. Дарэчы, я і мая сям'я прышчэплены «Спадарожнікам V».

***— Што можна сказаць з нагоды трамбозаў пасля вакцынавання?***

**У. Каранік:** Для тых вакцын, якія зарэгістраваныя ў Беларусі, такі верагодны пабочны эфект на сённяшні момант не апісаны.

***— Ці можна прышчапляцца пажылым, хворым на анкалогію пасля аперацыі?***

**І. Карпаў:** Калі чалавек атрымлівае імунадэпрэсіўныя прэпараты, гэта значыць праходзіць хіміятэрапію, то адказ на вакцынацыю можа быць недастатковы, але менавіта гэты кантынгент перш за ўсё мае патрэбу ў прызначэнні вакцын і ў той прафілактыцы, якая праводзіцца.

**У. Каранік:** Вакцынацыя не павялічвае рызыку вяртання хвароб. Зараз рэкамендуецца вакцынавацца праз месяц пасля завяршэння спецыяльнага лячэння — прамянёвай тэрапіі, аперацыі, хіміятэрапіі. Калі выяўленасць ад імунасупрэсіі значна менш.

***— Калі ўжо можна будзе выязджаць за граніцу?***

**У. Каранік:** На выезд краіна зачынена таму, што мы разумеем: грамадзяне, якія выехалі, вернуцца. Мы гэта бачылі падчас першай і другой хвалі, калі стаяла пытанне аб тым, як хутка вярнуць з-за граніцы восем тысяч нашых турыстаў і забяспечыць усіх ПЛР-даследаваннямі і дынамічным назіраннем. Тут абмежаванне не абсалютнае. Ёсць падставы, па якіх грамадзяне могуць спакойна выязджаць і вяртацца з-за граніцы. Дзесьці з назіраннем, дзесьці без яго.

***— Як будзе складвацца чацвёртая хваля каранавіруса?***

**У. Каранік:** Досыць цяжка прагназаваць. Нам бы хацелася, каб яна была меншая, чым другая хваля, пажадана, меншая, чым першая, але гэта залежыць ад усіх нас. На сёння нагрузка на сістэму аховы здароўя практычна ў тры разы ніжэйшая, чым у пікавыя значэнні, якія былі падчас другой хвалі, і мы вельмі спадзяёмся, што нашы мерапрыемствы па вакцынацыі, нашы супрацьэпідэмічныя захады і свядомасць грамадзян прывядзе да таго, што лічбы росту будуць не настолькі значныя, як мы бачылі раней.

***— Чаму «Спадарожнік V» не прызнаюць у краінах ЕС?***

**І. Карпаў:** Тут шмат фактараў. Ёсць складаная сістэма ацэнкі вытворчасці, штосьці не задаволіла камісію на адным з заводаў, але ніхто не выказаўся супраць яе эфектыўнасці і бяспекі. Далей ідуць пытанні канкурэнцыі, паставак, грошай. «Спадарожнік V» выкарыстоўваюць 70 краін, сярод іх немаленькія нябедныя азіяцкія краіны.

***— Чаму прымушаюць вакцынавацца?***

**У. Каранік:** Мы не прымушаем, мы пераконваем.

***— Хто будзе несці адказнасць пасля нанесенай вакцынамі шкоды?***

**У. Каранік:** У медыцыне ёсць вельмі добры пастулат: «пасля» не значыць «з прычыны». Калі будзе даказана, што нейкая медыцынская маніпуляцыя нанесла шкоду здароўю пацыента, у адпаведнасці з законам ёсць механізмы і кампенсацыі і адказнасці за гэта.

***— Калі варта вакцынавацца пасля хваробы?***

**І. Карпаў:** На працягу двухвасьмі тыдняў пасля поўнага выздараўлення.

***— Чаму наймальнік пазбаўляе прэміі, не пускае ў адпачынак і пагражае звальненнем тым, у каго адсутнічае вакцынацыя?***

**У. Каранік:** Напэўна, ваш наймальнік лічыць гэта самым дзейсным механізмам пераканання. Сказалі б яму «дзякуй» за тое, што ён так клапоціцца пра здароўе работнікаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 33 (559)

## Сяргей КАВАЛЬЧЫК:

# «ПРАФЕСІЯ СПАСЦІГАЕЦЦА ПРАЗ ГЛЫБІНЮ»

**ГЭТАЙ восенню свой 89-ы тэатральны сезон трупа Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага нарэшце сустрэла дома. Артысты ўбачыліся з публікай на роднай сцэне, капітальны рамонт якой вёўся пэўны час. Цяпер калектыў працуе над адаптацыяй існуючага рэпертуару да новых тэхнічных умоў, рыхтуецца да прэм'ер новых спектакляў і працягвае служыць у імя мастацтва. Пра закуліссе творчага працэсу, папаўненне трупы новымі кадрамі і публіку, якая не перастае любіць тэатр, мы пагутарылі з заслужаным дзеячам мастацтваў, рэжысёрам, мастацкім кіраўніком гэтай установы Сяргеем КАВАЛЬЧЫКАМ.**



***— Сяргей Міхайлавіч, новы тэатральны сезон ваш калектыў сустрэў на роднай сцэне. Якія былі пачуцці ад усведамлення, што цяпер вы зноў дома?***

— Перш за ўсё адчувалі радасць. І зараз спектаклі ідуць на нейкім душэўным пад'ёме. Акцёры месцамі нават празмерна энергетычна іграюць, бо ўсе вельмі засумавалі па родных сцэнах. І зараз гэта дае нейкае пачуццё эйфарыі. Разам з тым нашы спектаклі карэкціруюцца з улікам новых тэхнічных умоў. Прыцэльваюцца да светлавога абсталявання. Словам, працуем над нюансамі ў штатным рэжыме.

***— Амаль два гады тэатр даваў спектаклі на пляцоўцы Рэспубліканскага палаца культуры прафсаюзаў. Як пачуваліся ў гасцях?***

— Мы прызвычаіліся да сцэны Палаца культуры прафсаюзаў. Там нас прынялі і далі магчымасць пракату. І гэта самае галоўнае, бо без спектакляў артыст, нібы футбаліст без матчаў, губляе форму. Добра, што нашы акцёры маглі выходзіць на сцэну. Здараліся часам і розныя кур'ёзы. Напрыклад, калі ў мінулым годзе артысты выходзілі на сцэну пасля пандэміі, то вельмі хваляваліся, таму што адвыклі ад жывога кантакту з гледачамі. Хоць і былі анлайн-паказы і гэтак далей, але жывая энергетыка, якая ўзнікае паміж публікай і акцёрамі — рэч проста неперадавальная. Таму з'явіліся новыя адчуванні. У цэлым жа мы вытрымалі рэканструкцыю і цяпер рухаемся далей.

***— З новымі тэхнічнымі магчымасцямі сцэны што цяпер рыхтуеце?***

— Новыя магчымасці будуць асвойвацца ў працэсе пастановкі новых спектакляў. Нам быў адведзены толькі месяц на аднаўленне, і гэта вельмі мала. Мы падрыхтавалі ў пэўнай ступені пастаноўкі да пракату. Калі ж гаварыць, напрыклад, пра тое ж светлавое азадабленне, то нашаму цэху трэба цяпер асвоіць апаратуру, звыкнуцца, навучыцца з ёй працаваць. А ўжо потым можна будзе шукаць варыянты, як імправізаваць з ёю на сцэне ў спектаклях. Любы нюанс патрабуе часу, і калі хочацца зрабіць той жа цікавы светлавы пераход у пастаноўцы, то трэба ўсё дасканальна прадумаць, прапрацаваць. Пакуль што ў нас яшчэ не было магчымасці «гурманіць» са святлом. А вось у новых пастаноўках ужо зоймемся выпрабаваннем сваіх магчымасцяў.

***— І якіх прэм'ер варта чакаць у найбліжэйшы час?***

— У нас запланавана прэм'ера «Братоў Карамазавых». Зараз ужо ідуць рэпетыцыі на вялікай сцэне, і, думаю, усё ў нас атрымаецца.

У новым спектаклі заняты народны артыст Беларусі Аляксандр Ткачонак, Руслан Чарнецкі, Ягор Ляшок, Валерый Шушкевіч і іншыя. Містычны дэтэктыў па легендарным творы Фёдара Дастаеўскага рыхтуюць тут. Мастацкім кіраўніком спектакля выступаю я, а вось у ролі рэжысёра-пастаноўшчыка ўпершыню ўбачым народную артыстку Беларусі Вольгу Клебановіч.

Наступнай плануецца тут пастаноўка «Графа Монтэ-Крыста». Зараз ужо рыхтуюцца дэкарацыі. Хутка пачнецца пашыў касцюмаў. Так і працуем: завяршаем адзін праект і бяромся за іншы. Для дзіцячай аўдыторыі рыхтуем «Казку пра цара Салтана». Яе будзе ставіць мой вучань Дэвід Разумаў. Я даўно хацеў, каб у нашым рэпертуары з'явіўся Пушкін. Бо гэта той аўтар, творы якога з дзяцінства закладваюць добрыя ісціны зразумелай мовай. І калі ўсё атрымаецца, то ў наступным годзе ў нас з'явіцца такі спектакль.

***— У адным з інтэрв'ю вы сказалі, што трактоўка класікі на свой манер не ўсім удаецца. Калі казаць пра «Братоў Карамазавых» — якога чакаць прачытання?***

— Любы мастак спрабуе зрабіць класіку сучаснай, і зусім хутка зможаце ўбачыць, як гэта атрымалася ў нашай новай пастаноўцы. На мой погляд, класіку патрэбна рабіць актуальнай, але такім чынам, каб гэта не перашкаджала гледачу ўспрымаць аўтара твора. Я неяк бачыў спектакль па Астроўскаму, дзе на сцэне людзі хадзілі ў спартыўным трыко з лампасамі, але размаўлялі мовай класіка. І гэта глядзелася неарганічна. Ты ў зале не верыш убачанаму на сцэне. Тут альбо рэдактарскі тэкст трэба мяняць, альбо канцэпцыю рабіць іншай.

Візуальны рад, які мы даём са сцэны аўдыторыі, і аўтарскі тэкст павінны быць сугучнымі. А калі гэтага не адбываецца, то пытанне: ці варта так рабіць? Зразумела, творчага пошуку і спроб у тэатры ніхто не адмяняў. Але глядач павінен разумець, чаму яму паказваюць тыя ці іншыя рашэнні. Калі гэта робіцца проста, каб прадэманстраваць, што ты такі авангардыст і можаш зрабіць твор сучасным, то не варта. Класіка і без нас была і будзе жыць.

***— Ці папоўнілася трупа тэатра новымі людзьмі? І якую прастору для творчасці прапануеце маладым?***

— Да нас прыйшлі Аляксандр Душачкін, Кірыл Нікіцін, Аляксандр Гіранок. Таксама з гэтага года залічаны ў трупу чацвёра маіх студэнтаў, сярод якіх Дэвід Разумаў, Ягор Ляшоў, Віталіна Бідзюк (яны, дарэчы, занятыя ў «Братах Карамазавых»). Зараз маладым трэба ўліцца ў калектыў. Будуць змагацца за месца ў трупе і за сваю індывідуальнасць.

І маладыя артысты павінны быць нацэленыя не на тое, што вось атрымаюць галоўную ролю і ўзляцяць, бо так можна як узвысіцца, так і нізка ўпасці. Галоўная задача тут, каб маладыя артысты спасцігалі сутнасць прафесіі. Тым больш што цяпер вельмі няпросты час, калі ўсюды мы чуем размовы пра грошы і тое, як іх зарабіць. Але ж у пагоні за багаццем можна згубіць самае важнае. Акцёрская прафесія не церпіць мітусні, ёй патрэбны ўдумлівае і засяроджанае паглыбленне ў сутнасць персанажа, эпохі. І калі нашы маладыя акцёры навучацца так працаваць, то, перакананы, іх чакае вялікі творчы шлях. Калі ж будуць бегаць па здымках і толькі зрэдку забягаць у тэатр, то дарэмна растрацяць сябе. Хоць я іх разумею, нават успамінаю свае першыя рэжысёрскія работы, якімі яны гучнымі былі. Маладым акцёр ці рэжысёр заўсёды імкнуцца сігналізаваць: «Глядзіце, я прыйшоў!», аднак важна, каб гэтае самавыяўленне не забівала сэнс самога твора. Варта разумець, дзе менавіта прафесія. Асабліва цяпер, калі ідзе падмена каштоўнасцяў і любы чалавек у інтэрнэце адчувае сябе артыстам. І можа скласціся ўражанне, што не трэба і ніякіх намаганняў, ніякай вучобы. Узровень прафесіяналізму памылкова мераецца колькасцю хайпу, — чым яго больш, тым больш ты папулярны. У маладых людзей часам гэтыя з'явы адбіваюць жаданне спасцігаць глыбіні прафесіі, але ж без гэтага нікуды не дойдзеш.

***— Як перажываецца ў калектыве сыход такіх майстроў сцэны, як Барыс Луцэнка, Бэла Масумян?***

— Тэатр — жывы арганізм, дзе людзі прыходзяць і сыходзяць, а ён працягвае жыць. Калі сыходзяць такія мэтры, то шкадуем і гаворым пра тое, быццам вось у іх часы ўсё было па-іншаму. Разам з тым з аглядкай на іх хочацца трымаць марку. Хоць паняцце велічыні асобы вельмі ўтылітарнае. І вялікіх людзей пры жыцці часам не заўважаюць, крытыкуюць, а вось калі тыя паміраюць, то адразу становяцца нацыянальным здабыткам! Гэта як у прымаўцы: што маем, не беражом, а згубіўшы, плачам.

***— Хочацца спытаць у вас яшчэ пра публіку, якая прыходзіць сёння ў тэатр. Што можна сказаць пра культуру сучаснай аўдыторыі?***

— Зараз адбываецца своеасаблівая «перацяжка» чалавека. У грамадстве пануе ўсёдазволенасць, якая мяняе людзей. З'яўляюцца новыя тэхналогіі, новыя магчымасці, і гэтым пачынаюць карыстацца, але забываюць аб простых этычных момантах. Я вось заўважыў, што ў нас у крамах большасць наведвальнікаў, калі заходзіць, не прапускае тых, хто хоча выйсці. Але ж правілы этыкету ніхто не адмяняў. Тут не маюць значэння пол, узрост ці яшчэ нешта, проста тыя, хто выходзіць, вызваляюць месца для людзей, якія толькі прыйшлі. У нас жа ідуць напралом. Тое самае і ў тэатры. Мы не можам нікога перавыхоўваць. Але калі чалавек прыходзіць на спектакль і пачынае карыстацца мабільным тэлефонам, то перашкаджае іншым адпачываць і сам пазбаўляе сябе задавальнення ад прагляду. Я, напрыклад, калі іду ў тэатр і нават на рэпетыцыю, не бяру з сабой мабільны. Праўда, да нас у асноўным прыходзіць разумная і выхаваная публіка, якая любіць тэатр. І, відаць, усё больш з'яўляецца ў людзей разумення, што нейкія рэчы не да месца тут. Ёсць прытча адна, калі вучань прасіў у настаўніка дапамагчы яму спасцігнуць дао. Той у сваю чаргу запрасіў яго паесці. Сядзяць яны, а вучань не супакойваецца: навучы і ўсё тут. Тады настаўнік кажа: «Калі я ем, то толькі ем!»... А мы ж часам трацім жыццё на тое, каб зрабіць усё і адразу, а ў выніку нічога не паспяваем. Лепш сканцэнтравацца, дасягнуць мэты, а потым рушыць далей.

**Алена ДРАПКО,**
**фота аўтара.**

---

Юбілейны сезон

# ДАЛУЧЫЦЦА ДА КЛАСІКІ...

## Гродзенская капэла адкрыла 30-ы канцэртны сезон музыкай Дворжака

**Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь выступіў у абласным драмтэатры з праграмай, якая прымеркавана да 180-гадовага юбілею чэшскага кампазітара Антаніна Дворжака. Наступны канцэрт Гродзенскай капэлы адбудзецца ў кастрычніку і будзе прысвечаны творчасці Шастаковіча.**



У наступным годзе споўніцца 30 гадоў з таго часу, як у Гродне ўзнік унікальны музычны калектыў. Ён складаецца з сімфанічнага і духавога аркестраў, камернага хору, ансамбля салістаў. Ніводная ўрачыстасць горада не абыходзіцца без гэтага знакамітага калектыву. Яго кіраўнік — **заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Уладзімір БОРМАТАЎ** неаднаразова станавіўся лаўрэатам прэміі імя Аляксандра Дубко, самай прэстыжнай узнагароды Гродзеншчыны ў сферы культуры і мастацтва. А сам калектыў — лаўрэат многіх міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў.

Юбілейны сезон абяцае быць даволі насычаным і разнастайным. Пачаць яго вырашылі музыкай Антаніна Дворжака, які вельмі папулярны ва ўсім свеце, а вось на беларускай сцэне выконваецца нячаста. Між тым яго творчасць, лічыць кіраўнік капэлы, адпавядае менталітэту беларусаў. Гродзенская капэла ўпершыню прысвяціла чэшскаму кампазітару цэлую праграму. Яе кульмінацыяй стала сімфонія № 9 пад назвай «З новага свету».

Наступны канцэрт пад назвай «Планета Шастаковіча» адбудзецца 13 кастрычніка. Як адзначыў Уладзімір Борматаў, Дзмітрыю Шастаковічу даступныя розныя жанры. Ён выдатны філосаф у музыцы. Адначасова складаны і даступны. Гэта тыя якасці, якія ўласцівыя сапраўднаму генію.

— Мы імкнёмся выхаваць у людзей густ да музыкі, паказаць слухачу яе адвечную каштоўнасць, як эстэтычнае ўспрыманне музычнага твора эмацыянальна трансфармуецца ва ўсе сферы жыцця чалавека. Сусветны рытм паскараецца, у людзей усё менш магчымасцяў захаваць спакой. Класічная музыка выхоўвае гарманічныя адносіны да навакольнага свету, раўнавагу, цярпенне, інтэлектуальнае і талерантнае стаўленне адзін да аднаго. Да класікі прыходзяць як да Бога. Магчыма, гэта адбываецца не ў маладосці, але менавіта ў той момант, калі з'яўляюцца ўласныя свядомыя каштоўнасці. Гэта ўжо дарослае і мудрае рашэнне, — так акрэсліў кіраўнік капэлы сваё бачанне музыкі.

Юбілейны, 30-ы, сезон Гродзенскай капэлы працягнецца з верасня 2021 да чэрвеня 2022 года. За гэты час пройдуць дзясяткі канцэртаў як усёй капэлы, так і яе асобных падраздзяленняў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота grodnonews.**

Кінакрокі

# Як напамін аб галоўным і важным

**З панядзелка стартуе VI Фестываль дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія. DOC». Паказы кінастужак традыцыйна адбудуцца ў двух гарадах — у Мінску і Смаленску з 27 верасня да 1 кастрычніка 2021 года. Сёлета арганізатары атрымалі амаль 200 фільмаў-заявак з 21 краіны на ўдзел у мерапрыемстве. Але на працягу пяці фестывальных дзён гледачы ўбачаць праграму, у якую ў выніку адбору ўвайшлі толькі 30 фільмаў з 10 краін, сярод якіх Беларусь, Расія, Арменія, Узбекістан, Латвія, Азербайджан і іншыя.**



У асноўнай праграме наведвальнікі фестывалю змогуць убачыць 29 кінастужак, а фільм аднаго з членаў журы Сяргея Зайцава «Мой майстар Клас» будзе дэманстравацца ў рамках пазаконкурснага паказу. Што да тэматыкі і праблематыкі, то тут, вядома, знайшлі адлюстраванне знакавыя і актуальныя тэмы: 80-годдзе з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 60-годдзе з моманту першага палёту чалавека ў космас, 30-годдзе падпісання Белавежскіх дагавораў, пандэмія і іншыя. Варта адзначыць, што засталіся нязменнымі дзве традыцыйныя для кінафоруму тэмы — «Чалавек. Праўда жыцця» і «Кантынент Еўразія», і яны аб'ядналі ў тэматычныя блокі кінастужкі, не звязаныя з канкрэтнымі датамі. Як адзначаюць арганізатары, гледачоў на пляцоўках правядзення фестывалю чакаюць сустрэчы з цікавымі, змястоўнымі і нават нечаканымі кінатворамі.Так, напрыклад, мы зможам пашырыць свае веды аб прыродзе Якуціі і лад жыцця жыхароў гэтай мясцовасці альбо даведаемся больш пра Нюрнбергскі працэс, убачым кадры вызвалення Мінска, адчуем зноў атмасферу 90-х і шэраг іншых адкрыццяў перажывём разам з героямі экрана.

Так, сярод кінастужак, якія будуць дэманстравацца на вялікім экране непасрэдна ў Мінску 30 верасня і 1 кастрычніка, заяўлены расійскія «Фабзайцы» (рэж. Марыя Смялкова), «Ржэў. 500 дзён у агні» (рэж. Раман Ганган), «90-я. Траўма» (рэж. Арцём Варабей), фільм ад латвійскага рэжысёра Андрэя Якаўлева «Латвія. Прывід акупацыі», а Украіну прадставяць стужкай Аляксандра Ракаеда «Нюрнбергскі працэс. Без права на памілаванне». Яшчэ ўбачым кінаработы ад рэжысёра Яржана Сыздыкава з Казахстана «Жыць» і ад азербайджанскага рэжысёра Фарыза Ахмедава «Апошні».

А на наступны дзень увазе гледачоў прапанаваны «Незавершаныя ўспаміны» ад рэжысёра Армена Хачатрана з Арменіі, «Свет Вірус Чалавек Прырода» рэжысёра Шакіра Холікава з Узбекістана (паралельна запланавана правядзенне майстар-класа па дакументалістыцы), кінаработы ад Расіі "Дзіцячае пекла» (рэж. Вольга Курлаева, Андрэй Гаранін) і «Браты Гадзонавы. Сямёра бесмяротных» рэжысёра Аляксея Дзянісава.

**Гледачоў на пляцоўках правядзення фестывалю чакаюць сустрэчы з цікавымі, змястоўнымі і нават нечаканымі кінатворамі.**

Акрамя гэтага, 1 кастрычніка ў Мінску пройдзе маладзёжны конкурс «Еўразія. DOC. 4 хвіліны». Ён у гэтым годзе адбудзецца пяты раз і стане пляцоўкай для выказвання маладых рэжысёраў-дакументалістаў. І тут большасць удзельнікаў будуць гаварыць на мове кінамастацтва пра тое, як маладое пакаленне змяняе свет вакол сябе, дзе ёсць розныя шляхі самарэалізацыі: валанцёрства, экалогія, погляд на тэму вайны і г. д.

Усе мінскія паказы фестывальнага кіно пройдуць у кінатэатры «Беларусь». Кінафестываль сёлета праводзіцца пры падтрымцы Фонду гуманітарнага супрацоўніцтва краін — удзельніц СНД, Савета Рэспублікі, Мінгарвыканкама і іншых спонсараў. На ўсе паказы (яны пройдуць у гарадскіх кінатэатрах) уваход для наведвальнікаў вольны. Таму смела можна знаёміцца з праграмай на сайце кінафестывалю eurasia.film і планаваць сваю культурную праграму.

**Алена ДРАПКО.**

Вернісаж

# НЕБА АДКРЫВАЕЦЦА ЎЛЮБЁНЫМ

## Майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва трансфармуе прастору

**Калі б вы ведалі, з якога дроту паўстала неба... Словы сплятаюцца, як сплятаюцца ніткі ці вяроўкі, ці металічныя пруты, якія да таго ж спалучаюцца яшчэ з дрэвам альбо каменем. Вось так зойдзеш на выстаўку мастацкага тэкстылю, а там — такое свавольства. Але ж аўтарскі тэкстыль Таццяны Козік яднае ўсе яе работы на выстаўцы «У пошуках вольнага неба», якая размясцілася ў сталічнай Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. У чым адметнасць?**



**Паэтычнасць.** Імя аўтаркі, якая жыве ў Полацку, вядомае тым, хто сочыць за сучасным беларускім мастацтвам, а сёлета яна адзначае 60-годдзе. Таццяна Козік мела выстаўкі ў Мінску, удзельнічала ў вялікіх творчых праектах дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва ды ў маштабных агульнарэспубліканскіх выстаўках, неаднойчы прадстаўляла айчыннае дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва за мяжой. Таму што, падпарадкаваўшы сабе ніткі і тканіну, яна перайшла да матэрыялаў больш цвёрдых і ўпартых, ствараючы адмысловыя арт-аб'екты. Паспяхова. Бо і ў першых, і ў другіх матэрыялах адчула душу. І што б ні быў характар матэрыялаў, вобразы, што паўставалі з іх, маюць адну душу — беларускую. Яе мастацтва як наша паэзія: вершы могуць быць у розных рытмах, але з агульнай глыбіннай сутнасцю.

А яе мастацтва сапраўды як паэзія (што выяўляецца не толькі ў назвах). Вобразы, якія выхопліваеш з твораў-радкоў, часам рыфмуюцца, дапаўняючы адзін аднаго. Рыфмуюцца і матэрыялы: мастачка працуе з тканінамі рознай прыроды. Рыфмуецца нават метал: ёсць варыянты. І ўсё гэта спалучаецца ў рытмічнай кампазіцыі, якая запоўніла выставачную прастору. Усё разам — як паэма ў мастацтве, кожны можа счытаць свой сюжэт, убачыць герояў у пэўных абставінах і адчуць характар гэтых герояў. А яны могуць быць мяккімі ды пяшчотнымі, суровымі ды моцнымі, бы крэмень, гнуткімі ды пругкімі, калі трэба. Пра каго (што) гэтая выстаўка? А вось тут без варыянтаў. Таццяна Козік адлюстроўвае нашу прастору, беларускую волю, айчыннае неба.

**Цеплыня.** Малюнкі на льне — матэрыял, які мастачка асабліва любіць, — падкрэсліваюць, наколькі вытанчаны свет, які іна адлюстроўвае. І калі мяняецца матэрыял, становіцца больш тоўстым, то вытанчанасць застаецца — у вобразах, якія палоняць сваёй пластычнасцю. Утульнасці дадаюць прадметы адзення, зробленыя рукамі руплівай майстрыхі (у Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці яна калісьці вучылася мастацкаму аздабленню і мадэляванню вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці), пры ўсёй іх лёгкасці, хочацца загарнуцца — гэта як загарнуцца ў кавалак аблокаў.

Гэта выстаўка дае адчуванне цяпла ў халодныя дні, як дае яго адчуванне дома. Цеплыня і святло ідзе ад тэкстыльных панно — ад таго, пра што яны, як зроблены і з чаго. Ад нашага льну, сціплага па прыродзе, але шляхетнага ў аўтарскай інтэрпрэтацыі. Ад кампазіцый з нітак, якія быццам бы спрабавалі ўтаймаваць магутную энергію. А яна выйшла з-пад падпарадкавання — і скарыла метал. І вось ён ужо не выглядае як нязломная браня, ён стаў падатлівым, крохкім і лёгкім у незвычайных арт-аб'ектах з металічнай сеткі. Праз іх ідзе святло — яны акцэнтуюць яго сваёй празрыстасцю. Гэта як нашы думкі пра дом: крохкія ўспаміны пра бацькоўскі кут ствараюць каркас — палёт мар пра будучыню. Цяпло і святло — што яшчэ трэба, каб на выстаўцы адчуваць сябе як дома?



**Пошук.** Гаспадыня ўсё для гэтага зрабіла, нават здолела рассунуць межы ўяўлення пра матэрыялы ды тэхнікі. Ткацтва ў яе выглядае вельмі трывалым, надзейным. Аб'ёмныя металічныя кампазіцыі, наадварот, нібыта раствараюцца ў паветры. Але гэты аб'ём быццам бы сінтэзаваўся з вобразаў, што выслізнулі з плоскасці габеленаў. Той выпадак, калі матэрыяльныя рознасці суіснуюць у прасторавай еднасці, што закладзена канцэптуальна (куратар выстаўкі Міхась Цыбульскі).

**Таццяна Козік мела выстаўкі ў Мінску, удзельнічала ў вялікіх творчых праектах дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва ды ў маштабных агульнарэспубліканскіх выстаўках, неаднойчы прадстаўляла айчыннае дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва за мяжой.**

І той выпадак, калі можна перагледзець свае адносіны да дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, а некаторыя нават могуць адкрыць для сябе яго магчымасці, здольнасць да неверагодных эксперыментаў. У ім прыгажосць і майстэрства. І філасофія.

**Лёгкасць.** Гэта аповед пра тых, хто мае крылы: птушкі, анёлы, аблокі ды людзі, для якіх палёт — натуральны стан творцы. Ім мала пэўнай тэрыторыі. Яны лунаюць у паветры, прыводзяць у рух яго пласты, запускаючы ветракі — вечныя млыны жыцця, якія, здаецца, стаміліся перамолваць у муку нашы думкі і пачуцці. Але сваю справу зробяць: напоўняць прастору энергіяй, народжанай творчасцю. Калі ў доме ёсць жыццё, то ў ім павінна быць цёпла.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Промветсервис»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Предприятие как имущественный комплекс (регистрационный номер 0001476, свидетельство № 3658 от 26.02.2021) | 750 000,00 | 75 000,00 | 37 500,00 |
| В отношении Лота проводятся первые торги | | | | |
| Дата и время проведения торгов | **28 октября 2021 года в 14.00 (регистрация – с 13.30 до 14.00)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 | | | |
| Прием заявлений | Начало приема заявлений в 10.00 27.09.2021 г. Окончание приема заявлений в 16.00 27.10.2021 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| Местонахождение имущества | Республика Беларусь, Минская обл., Борисовский район, Лошницкий с/с, восточнее аг. Лошница | | | |
| Условия для участия в торгах | 1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info/**.<br>2. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту 1, принадлежащему ООО "Промветсервис", проводимых 28.10.2021. **Срок внесения задатка: с 27.09.2021 в 10.00 по 27.10.2021 в 16.00.**<br>3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97). Дополнительная информация по предмету торгов – **Леонид (+375445492417).**<br>4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста составляет 2,5 % от конечной цены предмета торгов.<br>Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 14 (календарных) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена на следующих условиях:<br>- 30 % от конечной цены предмета торгов (включая задаток, перечисленный до проведения аукциона) перечисляются в течение 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи;<br>- оставшиеся 70 % от конечной цены предмета торгов перечисляются ежемесячно равными долями в течение шести месяцев со дня заключения договора купли-продажи.<br>5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Андрею (+375447472022).<br>7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании действующего законодательства Республики Беларусь.<br>8. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет | | | |
| Организатор аукциона | **ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** | | | |
| Продавец | **ООО «ПРОМВЕТСЕРВИС» (220034, г. Минск, ул. З. Бядули, 12–2а), тел. +375447472022 (Андрей)** | | | |

Бяспечная праца

# Уборачная кампанія — пад наглядам спецыялістаў

**Падчас уборачнай кампаніі больш за 1400 сельгасарганізацыям аказана дапамога ў арганізацыі працоўнай бяспекі работнікаў.**

Пачынаючы з 1 ліпеня бягучага года Дэпартаментам дзяржаўнай інспекцыі працы пры правядзенні наглядных мерапрыемстваў у 153 сельгасарганізацыях спынена звыш 3,4 тысячы парушэнняў.

З-за парушэнняў патрабаванняў эксплуатацыі вытворчага абсталявання, якія маглі прывесці да няшчасных выпадкаў з работнікамі, прыпынялася (да ліквідацыі выяўленых парушэнняў) работа 260 машын і механізмаў, а таксама 16 вытворчых участкаў.

Па патрабаванні дзяржаўных інспектараў з-за непрымянення неабходных сродкаў індывідуальнай аховы, непраходжання медыцынскіх аглядаў, навучання і інструктажоў па ахове працы часова адхілена ад працы 715 работнікаў (да ліквідацыі выяўленых парушэнняў).

За дапушчаныя парушэнні аштрафавана 57 службовых асоб сельскагаспадарчых арганізацый, 40 работнікам вынесены папярэджанні.

У мэтах прафілактыкі траўміравання работнікаў, аказання практычнай дапамогі ў забеспячэнні аховы працы мабільнымі групамі абследавана 1271 сельскагаспадарчая арганізацыя і рэкамендавана ліквідаваць звыш 11,4 тысячы парушэнняў патрабаванняў бяспекі. З-за грубых парушэнняў патрабаванняў аховы працы па рэкамендацыях мабільных груп часова прыпынялася эксплуатацыя 445 машын і механізмаў і 13 вытворчых участкаў, адхілены ад працы 804 работнікі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## Извещение о проведении 13 октября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н, составленному по состоянию на 25.05.2009 года;<br>капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть, протяженностью 175,6 м, состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни; капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108, общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса, с пристройкой, асфальтно-бетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами); капитальное строение (гудронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гудронохранилище объемом 2061 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 куб. м; капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106, общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979, общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой; капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107, общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой; капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986, общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980, общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада; капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981, общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями; капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982, общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха; капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод, протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков; капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженностью – 201 м; капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б\н, составленному по состоянию на 16.06.2009 года; капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев; капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженность 646,6 м, напряжением 04 кВ, состоящая из четырех участков; капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ, способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт; капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180, общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодеченским филиалом РУП "Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру";<br>узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940; резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П» инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695;<br>котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715 |
| Сведения о земельных участках:<br>площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310;<br>площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541 |
| Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43 |
| Начальная цена: 215 241,22 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 21 500,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **13 октября 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.09.2021 г. по 11.10.2021 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам:
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).
Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Добрица» (продавец) проводит открытый повторный аукцион по продаже имущества в составе:**

## Лот № 1: прицеп MAZ 8561 00, тип ТС – прицеп специальный самосвал,

**№ кузова Y3M856100A0004316, 2010 года выпуска, регистрационный знак А 8141 А-5, цвет – серо-желтый, особые отметки: ПТС ТА011562 от 25.07.2010, контракт – 3775/158-10М от 24.07.2010.**

Начальная цена Объекта с НДС (20 %) **– 15 120,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены (**1 512,00** бел. руб.).

## Лот № 2: токарный станок 16е16кп,

**инвентарный № 175, 1972 года выпуска.**

Начальная цена Объекта с НДС (20 %) **– 1 512,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены (**151,20** бел. руб.).

**Имущество расположено по адресу: Минская область, Солигорский район, аг. Зажевичи, ул. Центральная, 1а (территория машинно-тракторного парка).**

**Задатки перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 10 (десяти) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере: по лоту № 1 – 5 (пяти) процентов, по лоту № 2 – 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 01.07.2021.

Аукцион состоится **07.10.2021 г.** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.10.2021 г.** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра: (80174) 279 547, (8044) 726 84 36.**

УНП 690026647

**ЗАО «ЦЕНТР ПРОМЫШЛЕННОЙ ОЦЕНКИ» информирует о внесении изменений в извещение о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Минскому филиалу Минского облпотребобщества, назначенных на 05.10.2021 (публикация извещения газета «Звязда от 23.09.2021), по начальной цене лотов:**

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Здание магазина** (Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, ул. Слуцкое шоссе, 26) | **650 579, 60** |
| 2 | **Административное здание** (Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Молодежная, 12) | **991 440,00** |
| 3 | **Кафе-бар «Отдых»** (Минская обл., Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Гвардейская, д. 5) | **416 000,00** |
| 4 | **Столовая** (Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Калинина, д. 36) | **409 000,00** |
| 5 | **Магазин № 1** (Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, аг. Озерцо, ул. Центральная) | **423 000,00** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

УНП 600037767

# СУСТРАКАЕМ ВОСЕНЬ ПРАВІЛЬНА

## Час праступ, час дэпрэсій: як засцерагчыся ад восеньскіх небяспек?

**Вось і пачаўся «высокі сезон» праступ. Вірусы атакуюць, надвор'е псуецца, від з акна наганяе тугу. Восень у нашых шыротах рэдка настройвае на пазітыўнае ўспрыманне жыцця. Мы вырашылі пагутарыць пра тое, як пераджыць восень без страт, з практыкамі — медыкамі раённага цэнтра эпідэміялогіі буйнога горада. І вось што ўдалося высветліць...**



Акрамя вірусаў, нас пастаянна атакуюць дрэнныя навіны пра ковід. На гэтым фоне многія неяк забыліся на больш звыклыя восеньскія небяспекі — грып, ВРЗ і ВРВІ. А, між тым, яны не дрэмлюць. І з прыходам халодных дажджоў гатовыя нагадаць пра сябе.

### Ці патрэбна «ўмераная абарона»?

— Для правільнага падыходу да захворвання не мае значэння, што гэта за вірус грыпу і які штам. Важна наступнае: гэта вірус, ён перадаецца паветрана-кропельным шляхам і паражае органы дыхальнай сістэмы. Гэтых трох складнікаў дастаткова, каб сарыентавацца ў правілах прафілактыкі і лячэння, — кажа **ўрач-гігіеніст ДУ «Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна г. Мінска» Валянціна ГАПАНОВІЧ.** — Калі вы сутыкняцеся з вірусам, а ў вашай крыві няма ахоўных антыцел, вы захварэеце. Антыцелы выпрацоўваюцца ў адным з двух выпадкаў: калі вы перахварэлі або калі прайшлі вакцынацыю.

Часта людзей ад вакцынацыі супраць грыпу спыняе інфармацыя, што вакцына не здольная прадухіліць любую праступу (так у народзе агулам называюць усё, што «насмарк, баліць горла, павышаная тэмпература і няма сіл ісці на работу»), адзначаюць дактары, і ад грыпу яна абараняе не на сто працэнтаў — дае толькі «ўмераную абарону». Стапрацэнтна эфектыўнай вакцыны не існуе. Але тут дзейнічае прынцып «Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго».

— Неабходна, каб прышчапілася 40 % насельніцтва (горада, раёна і г. д.), і тады мы забяспечым эфектыўную абарону ад грыпу, — кажа суразмоўца.

Калі вы маладыя, здаровыя і ўпэўненыя, што грып не ўяўляе для вас пагрозы і вам не патрэбна вакцына, падумайце аб тым, што, захварэўшы, цалкам верагодна, заразіце дзяцей, пажылых і людзей з аслабленым здароўем, якія могуць памерці ад грыпу, папярэджваюць практыкі. Група рызыкі па грыпе — дзеці ад 6 месяцаў да 2 гадоў, дарослыя, старэйшыя за 65 гадоў, людзі з хранічнымі захворваннямі (астма, дыябет, ішэмічная хвароба, хваробы нырак, людзі, якія перанеслі інсульт і г. д.), а таксама ўсе, хто мае імунадэфіцыт, і цяжарныя жанчыны.

### Ці можна «злавіць» вірус на прагулцы?

З прыходам восені кожны год як грыбы растуць артыкулы пра цудадзейныя ўласцівасці мёду і прыродны антыбіётык часнок. Гэтым шляхам часцей ідуць пажылыя людзі, а моладзь па восені актыўна скупляе вітаміны і імунастымулятары ў аптэках.

— Няма прэпаратаў і сродкаў народнай медыцыны з даказанай прафілактычнай эфектыўнасцю. Ні цыбуля, ні часнок, ні зёлкі, ні адвары, ні нават імунастымулятары з аптэкі, якія вы прымаеце або даяце дзіцяці, не могуць абараніць вас ад любога рэспіраторнага віруса наогул ці ад віруса грыпу ў прыватнасці, — кажа суразмоўца. — Усе гэтыя супрацьвірусныя прэпараты, імунастымулятары і «вельмі карысныя вітаміны» — лекі з недаказанай эфектыўнасцю. Іх эфектыўнасць — у большай ступені «эфект плацэба». Яны задавальняюць нашу разумовую патрэбнасць «нешта рабіць». Галоўная перавага ўсіх гэтых прэпаратаў — псіхатэрапія.

**Такім чынам, прафілактыка ў сезон праступ: што раяць практыкі?**

● Крыніца віруса — чалавек. Чым менш людзей вакол вас, тым менш у вас шанцаў захварэць. Пайсці на работу пешшу — добрая ідэя. Адмовіцца ад шопінгу без крайняй неабходнасці — таксама. Яшчэ і сэканоміце на пакупках.

● Маска — рэч карысная, але не панацэя. Яе пажадана насіць захварэламу, калі ўсе вакол здаровыя. Яна не затрымлівае вірус, але затрымлівае кроплі сліны.

● Не чапайце свой твар. Часта мыйце рукі, насіце з сабой сурвэткі для дэзінфекцыі. Не эканомце на іх — здароўе даражэйшае! Рукі — крыніца заражэння. Пацыент датыкаецца да свайго твару (вірус трапляе яму на рукі), затым хапае ўсё вакол. Вы дакранаецеся да прадметаў, да якіх дакрануўся ён, і... прывітанне, вірусная інфекцыя!

● Навучыцеся чхаць і кашляць у локцевы згіб, а лепш — у насоўку (і бяспечна для навакольных, і шляхетна!). Дарэчы, папяровыя банкноты — таксама крыніца распаўсюджвання вірусаў. Лепш карыстацца банкаўскімі карткамі.

● Выходзьце на прагулку! Вірусныя часціцы могуць захоўваць актыўнасць у сухім, цёплым, застойным паветры, але амаль імгненна разбураюцца ў прахалодным, вільготным паветры, што рухаецца. «Злавіць» вірус на прагулцы практычна нерэальна. Маску на вуліцы насіць не трэба — лепш падыхайце свежым паветрам.

● Часцей праветрывайце кватэру. Аптымальныя параметры — тэмпература каля 20 градусаў, вільготнасць 50—70 %. У сезон грыпу і праступ часцей мыйце падлогу, уключайце ўвільгатняльнік паветра, настойвайце на ўвільгатняльніках у дзіцячых садках. Лепш апрануцца цяплей, чым уключаць дадатковае абаграванне.

● Галоўныя ворагі імунітэту — сухое паветра і прэпараты, якія выклікаюць перасыханне слізістых абалонак (у асноўным супрацьалергічныя і амаль усе «камбінаваныя сродкі ад праступы»). Увільгатняйце слізістыя абалонкі. Гэта элементарна: 1 чайная лыжка паваранай солі на літр кіпеню. Атрыманым растворам як мага часцей закапвайце нос (можна нават кожныя 10 хвілін). Ці проста купіце фізраствор у аптэцы. Асабліва важна ўвільгатніць слізістыя, калі вы ідзяце туды, дзе шмат людзей.

### Што есці, каб не маркоціцца?

Верагоднасць захварэць на грып і ВРВІ сур'ёзна зніжаецца пры правільным харчаванні, актыўным ладзе жыцця, здаровым сне і добрым настроі. Праўда, якраз з настроем восенню зусім бяда. Але ў нашых сілах калі не пазбавіцца цалкам, то па меншай меры палегчыць «сімптомы» традыцыйнай восеньскай хандры. Аказваецца, «любімы час сутак» у дэпрэсіі — раніца. Таму так важна парадаваць сябе менавіта пасля абуджэння. Падыдзе ванна з духмянай пенай, любімая музыка (песня павінна несці пазітыўны пасыл), кубачак смачнай кавы (гарбаты). Перагляд рацыёну — таксама адзін з дзейсных спосабаў барацьбы з дрэнным настроем. Невыпадкова ўсходняя медыцына (якая на многія стагоддзі старажытнейшая за еўрапейскую) лічыць навуку пра ежу важным раздзелам лячэння любых хвароб. Каб стала весялей, адмоўцеся ад аднастайнай, цяжкай ежы. Дарэчы, **існуюць прадукты, якія з'яўляюцца «хуткай дапамогай» для нашага настрою. Іх пяць, і яны цалкам даступныя.**

✓ **Бразільскі арэх.**

— Ён багаты селенам, а без гэтага мікраэлемента чалавек становіцца раздражняльным, нервовым і хутка стамляецца, — тлумачыць Валянціна Гапановіч.

Восенню штодня з'ядайце 2-3 бразільскія арэхі, гэта палепшыць настрой і падтрымае сэрца.

✓ **Бананы.** Пра тое, што яны ўтрымліваюць вітамін $B_6$ і тым самым спрыяюць сінтэзаванню ў арганізме гармону радасці серататаніну, напэўна, ведаюць усе. Але акрамя гэтага, бананы багатыя каліем, які не толькі патрэбны сэрцу, але і забяспечвае здароўе нервовых клетак.

✓ **Чарніцы** — адзін з магутных антыдэпрэсантаў. Дыетолагі сцвярджаюць, што гэтыя ягады паляпшаюць настрой у лічаныя хвіліны. А заадно валодаюць антыаксідантнымі і супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі — то-бок паскараюць выздараўленне ад праступ і дапамагаюць не старэць. А таксама паляпшаюць кароткачасовую памяць і нармалізуюць каардынацыю руху.

✓ **Курыныя яйкі** — скарбніца вітамінаў групы В, якія дапамагаюць прадухіліць развіццё дэпрэсіі і паляпшаюць настрой. А яшчэ ў яйках шмат халіну, які неабходны для нармальнай работы мозгу.

✓ І, нарэшце, **грэчка!** Танны і пры гэтым дзейсны антыдэпрэсант.

— Грэчневая каша абавязкова павінна з'явіцца на вашым стале, калі апошнім часам вы заўважылі павышэнне трывожнасці, — кажа суразмоўца. — Цынк, фосфар, магній і вітаміны групы В, якіх шмат у грэчцы, паляпшаюць кровазабеспячэнне і паскараюць перадачу імпульсаў у мазгавых клетках. Грэчка не толькі зніжае трывожнасць, але і паляпшае сон і нават памяншае галаўны боль.

І яшчэ адна парада. Менавіта восенню асабліва важна навучыцца адпачываць. Медыкі адзначаюць, што калі чалавек псіхалагічна расслабляецца, колькасць інтэрлейкінаў (галоўных клетак імуннага адказу супраць вірусаў грыпу і рэспіраторных інфекцый) у крыві павышаецца. Знайдзіце вольны час для хобі, якое прыносіць радасць. Але рэлакс не варта блытаць з гультайствам. У сумных і нудных ад марнавання часу людзей (як пацвярджаюць даследаванні) колькасць інтэрлейкінаў у крыві не расце.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Карысныя парады

# НЕ ПАДДАВАЦЦА!

## Асенняя хандра — гэта адаптацыя арганізма да недахопу святла

**Паводле статыстыкі, у восеньскія месяцы ў большасці з нас адбываецца зніжэнне працаздольнасці і з'яўляюцца прыкметы дэпрэсіі. Восеньская стомленасць прыходзіць і тады, калі яе чакаюць, — як толькі мы пачынаем уяўляць, як нам цяжка працаваць (ды і іншымі справамі займацца) у гэты перыяд. Такім чынам, мы самі праецыруем восеньскую хандру на найбліжэйшую перспектыву.**

— З пункту гледжання медыцыны восеньская стомленасць, або дэпрэсія, — гэта сезонны эмацыянальны прыгнечаны стан. І натуральная рэакцыя чалавечай псіхікі на пагаршэнне надвор'я, а звязана яна з парушэннем абмену гармонаў — сератаніну і мелатаніну, — тлумачыць **валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Жанна АЛЯКСАНДРАВА.** — Недахоп сонечнага святла і перабудова арганізма на зімовы рытм не праходзяць для арганізма лёгка.

### Прыкметы восеньскай стомленасці

Калі вы метэаадчувальныя і востра рэагуеце на змену надвор'я, да прыходу восені варта рыхтавацца загадзя. Восеньская хандра набірае сілу паступова. Настрой становіцца няўстойлівым і мяняецца некалькі разоў за дзень. З'яўляецца раздражняльнасць, ад гэтага часцей узнікаюць канфлікты і недастатковае паразуменне з навакольнымі. Узнікае жаданне больш спаць і нічога не рабіць, з'яўляецца абыякавасць да ўсяго. Зніжаецца імунітэт і з'яўляецца адчуванне, што захварэў. Абвастраецца апетыт або, наадварот, знікае цікавасць да ежы. З цяжкасцю хапае сіл на ўвесь працоўны дзень.

### Харчаванне, фізічная актыўнасць і хобі

Як жа дапамагчы сабе захаваць энергію і перамагчы стомленасць?

Для таго каб знізіць верагоднасць з'яўлення наступстваў восеньскай дэпрэсіі, неабходна патурбавацца пра ўмацаванне свайго імунітэту загадзя. Звярніце ўвагу на рацыён. Пачніце больш ужываць садавіны, багатай на аскарбінавую кіслату.

Не ігнаруйце заняткі спортам. Умераная фізічная нагрузка дабратворна ўздзейнічае на нервовую і імунную сістэмы. Трэніроўкі ўмацоўваюць мышцы, павышаюць вынослівасць, здымаюць негатыўны ўплыў стрэсу.

Падчас фізічнай працы павялічваецца дастаўка кіслароду да клетак мозгу, што дазваляе актывізаваць мазгавую дзейнасць і павысіць працаздольнасць. Акрамя таго, пры фізічнай актыўнасці адбываецца спальванне тлушчаў, што дае магчымасць скінуць лішнія кілаграмы.

Хобі — найлепшы сродак ад восеньскай маркоты. Для кожнага чалавека важна займацца любімай справай, але ўвосень гэтая патрэба ўзмацняецца. Калі вы хацелі заняцца нейкай не ўласцівай для вас справай, не адкладайце гэта на доўгі час, бо нерэалізаваныя творчыя жаданні — спрыяльная глеба для развіцця дэпрэсіі і восеньскай маркоты.

Не забывайце, што перамога над дэпрэсіўнымі станамі — ці гэта восеньская непрыемнасць, ці спадчынны «падарунак» — цалкам залежыць ад вас саміх. Калі арганізму дапамагчы, ён справіцца з гэтай хваробай з мінімальнымі стратамі.

Каб знізіць рызыку дэпрэсіі або змены настрою, засвойце некалькі правіл: старайцеся весці здаровы лад жыцця; прытрымлівайцеся правільнага харчавання; адмоўцеся ад шкодных звычак; займайцеся спортам і часцей бывайце на свежым паветры; знайдзіце хобі; не трымайце ў сабе назапашаныя эмоцыі, старайцеся выгаварыцца сябрам ці блізкім. І самае галоўнае — не падайце духам і кажыце сабе: «Усё будзе добра!». А таксама не паддавайцеся ляноце і жаданню сябе пашкадаваць, старайцеся быць пазітыўным нават у нялёгкія перыяды.

**Алена КРАВЕЦ.**

# З ПЛЕМЕНІ РАДЗІМІЧАЎ

## СУРОВАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ БЫЦЦЯ

Не верце тым, хто расказвае, што ў глыбінцы няма чаго глядзець. Ёсць, і адным днём тут не абыдзешся. Звычайна на знаёмства з райцэнтрам у мяне ледзь хапае двух дзён. І гэта без уліку аддаленых вёсачак (або, як модна зараз казаць, лакацый), дзе і людзей амаль не засталося, але дух даўніны захаваўся. На жаль, туды ў адзіночку, сапраўды, складаней дабрацца, чым да райцэнтра.

Чэрыкаву пашчасціла, што ён знаходзіцца на шляху, які звязвае адразу некалькі райцэнтраў Магілёўшчыны. Таму толькі з Магілёва туды нават у будні дзень грамадскі транспарт курсіруе ледзь не кожную гадзіну. На сайце ёсць некалькі адрасоў, дзе можна прыпыніцца на часовае пражыванне. У асноўным гэта аграсядзібы. Гаспадыня адной з іх гатова была ўзяць мяне пад свой дах за 15 рублёў за суткі. Але я ўсё ж такі выбрала гасцініцу мясцовага жылкамгаса «Сож». Спадабалася, што яна ў цэнтры горада, у непасрэднай блізкасці ад аўтавакзала, парку, музея і іншых культурных месцаў. І гэта самы вялікі яе плюс. Майце на ўвазе, што ў гасцініцы толькі 13 нумароў, прычым 10 з іх — чацвёртай катэгорыі без выгод і нават тэлевізара. Толькі два нумары другой катэгорыі з санвузлом і гарачай вадой, а таксама халадзільнікам і тэлевізарам. Яшчэ адзін прызначаны для інвалідаў-калясачнікаў.

Нумар чацвёртай катэгорыі каштуе крыху болей чым 8 рублёў за месца, другой — 18 рублёў з невялікім «хвосцікам». Вядома, я выбрала апошні. Уразіла, што ён двухпакаёвы і нават трохпакаёвы, калі лічыць прыхожую. У дзвюх спальнях па два ложкі! Мяне супакоілі, што падсяляць нікога не будуць, але ж усякае магло быць. З першага погляду падалося, што мэблі зашмат. Але гэта таму, што нумар чатырохмесны. На кожны ложак прыходзіцца па крэсле і па тумбачцы плюс стол і тумба пад тэлевізар. У прыхожай побач з шафай — амаль такой жа вышыні халадзільнік. Праз невялікі вузкі калідорчык — прыбіральня і санвузел, які па памерах як спальні. Калі не лічыць дробязяў, то нумар дастаткова прыстойны. На падлозе — лінолеум з малюнкам пад паркет, ложкі з натуральнага дрэва, невялічкія дыванкі перад імі... Сцены, пафарбаваныя ў нераздражняльны колер, на столі — сімпатычная люстра, і нават усе лямпачкі гараць. Магчыма, той, хто карыстаўся паслугамі гэтай гасцініцы, крытычна ўсміхнецца і ўспомніць усё, што я не пералічыла. Але ж тут многае залежыць ад чалавека. Як пісаў вялікі паэт XI стагоддзя Амар Хаям: «В одно окно смотрели двое. Один увидел дождь и грязь. Другой — листвы зелёной вязь, весну и небо голубое. В одно окно смотрели двое...» Але хопіць пра зямное. Кідаем сумкі і гайда ў горад па ўражанні.

**Савецкі лётчык-знішчальнік Яўген Нікалаенка — першы ў Магілёўскай вобласці Герой Савецкага Саюза сярод ваенных. Яму гэта званне прысвоена ў лютым 1938 года.**



Знішчальнік у парку імя Героя Савецкага Саюза Яўгена НІКАЛАЕНКІ.

## ХУТКА, СМАЧНА, НЯДОРАГА

Для пачатку шукаем месца, дзе падсілкавацца. Як той казаў, не паеў — адкуль сілы будуць? Прыемна ўразіла, што ў цэнтры на невялікай адлегласці некалькі такіх месцаў. Гэта кавярня «MiX», кафетэрый у краме сеткавіка «PROзапас», яшчэ адна кавярня каля аўтастанцыі, з 12 гадзін да 21.00, а ў пятніцу і суботу да 22.00 працуе рэстаран «Сормава». Цэны вельмі дэмакратычныя. Нават у рэстаране можна нядрэнна паесці за сімвалічную плату. Напрыклад, амлет з грыбамі каштаваў у сераду ўсяго каля двух рублёў. Праўда, ён трапіў у пералік страў, на якія дзейнічалі акцыі. У кафетэрыі наогул цэны на кулінарныя вырабы былі ад 49 капеек. Для мінімалістаў, якія абыходзяцца кавай і чымсьці смачненькім, як варыянт — ежа з крамы. З апошнімі тут наогул няма праблем, у тым ліку ад буйных і шырокавядомых рытэйлараў, якія працуюць дапазна. У гасцінічным нумары (той, што даражэйшы) ёсць электрачайнік і шклянкі.

Не стрымалася, яшчэ зазірнула ў мясцовы універсам «Мерыдыян». Трапіла якраз на завоз посуду беларускага Добрушскага фарфаравага завода. Хадзіла, напэўна, паўгадзіны як па выставцы, не магла адвесці вачэй. Прадавец сказала, што такіх прыгожых талерак ды яшчэ ў такім шырокім асартыменце ім даўно не прывозілі. Мне нават падалося, што за постсавецкі перыяд айчынная кераміка ўпершыню перамагла кітайскую. Апошняя была амаль непрыкметная на фоне паставак з Добруша і Радашковічаў. Наогул, крамы ў Чэрыкаве, як прадуктовыя, так і прамысловыя, прыемна ўразілі. Адчуваецца, што тут адсочваюць попыт насельніцтва і прапаноўваюць шырокі асартымент. Але, магчыма, мне пашчасціла прыехаць у дзень завозаў.



Роспіс Чэрыкаўскага храма ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы.

## ЗЯМНОЕ І НЯБЕСНАЕ

Не ведаю, як іншыя, але я заўсёды пачынаю знаёмства з населеным пунктам з музея і культавых пабудоў. У Чэрыкаве царква і касцёл знаходзяцца ў гістарычных будынках, але калі каталіцкі храм такім і быў першапачаткова, то праваслаўны цяпер месціцца ў былым дваранскім сходзе (потым тут была школа, пасля вайны — райаддзел міліцыі).

У касцёл імя Панны Марыі, на жаль, трапіць не атрымалася. Пабудову XIX стагоддзя ў 1950 годзе аддалі пад Дом культуры, пасля вяртання каталіцкай царкве яна аказалася надта вялікая для маленькай гарадской абшчыны, таму дзверы храма пакуль зачыненыя. Праваслаўная царква ў гонар Раства Прасвятой Багародзіцы больш запатрабаваная. Дарэвалюцыйны храм знаходзіўся праз дарогу ў «трохкутніку», як называюць з-за яго формы парк каля аўтастанцыі. Зараз там стаяць зенітка і помнік чырвонаармейцам.

У цяперашняй чэрыкаўскай праваслаўнай царкве цёпла і ўтульна. Зверху прыгожы роспіс, зроблены мясцовым майстрам, які, па адных звестках, жыве ў Чэрыкаве, па іншых — у Санкт-Пецярбургу. Па словах работніцы храма, будынак перадалі вернікам у 1990-я гады. Прыйшлося шмат папрацаваць, каб прывесці яго ў парадак. Вельмі шмат было кабінетаў і перагародак. У асноўным шчыравалі прыхаджане, грашыма дапамагаў мясцовы прадпрымальнік Марачкін, удакладніла жанчына. Шмат сіл уклаў у храм протаіерэй Мікалай Жук — благачынны Чэрыкаўскай царкоўнай акругі, які працуе тут 20 гадоў. Перад ім быў айцец Ціхан (Шарабурка), які, лічы, перабудоўваў храм. З яго імем тут звязаны нават мясцовы цуд.

«Калі ён памёр і яго павезлі хаваць, у горадзе на некалькі гадзін пагасла электрычнае святло, — успамінае прыхаджанка. — Відавочцы расказваюць, што пачулі воплеск — над храмам разарваўся вогненны шар. Не верыце? Можаце ў любога іншага жыхара нашага горада спытацца. І нават энергетыкаў». Жанчына ўсміхаецца і дзеліцца версіяй: бацюшка пажартаваць любіў, можа, так развітаўся. А яшчэ дадала, што, перад яго смерцю ў храме заміраточыла ікона Казанскай Божай Маці. «І наш бацюшка крыху засумаваў», — падсумавала мая гід.

## ДЗЁННІК КНЯГІНІ АБАЛЕНСКАЙ

Чэрыкаўскі край вельмі багаты на гісторыю. За крыху болей чым рубель вам раскажуць у мясцовым гісторыка-краязнаўчым музеі ўсё, што тут адбывалася ад старажытных часоў да сённяшняга часу. Мой экскурсавод Уладзіслаў Сяргееў адразу ж пацікавіўся, наколькі падрабязную я хачу пачуць інфармацыю. Але нават па хуткай праграме затрымалася я тут на паўтары гадзіны. Пра тое, што тут жывуць нашчадкі радзімічаў, пра часы існавання ў горадзе Магдэбургскага права, школу-камуну на чале з родным братам Панцеляймона Лепяшынскага — Мадэстам і яе выбітных вучняў, прыезд у горад імператрыцы Кацярыны II, падарожжа праз Чэрыкаў акадэміка Пецярбургскай Акадэміі навук Васіля Севергіна, які пакінуў свае ўражанні ў запісках вандроўніка па заходніх правінцыях Расійскай дзяржавы, і шмат чаго іншага можна пачытаць на сайце райвыканкама. Мяне ж больш цікавілі падрабязнасці пра род князёў Абаленскіх, якія жылі на Чэрыкаўшчыне перад рэвалюцыяй. Экспанатаў, звязаных з імі, на жаль, нямат. У музеі захоўваюцца ўзоры кафлі і цэглы з маёнтка ў Горках, фрагмент з кнігі, якая была ў іх бібліятэцы, некалькі фотаздымкаў і радавод. Маёмасць на тэрыторыі сучаснай Магілёўскай вобласці сямейства атрымала за правы на Малдавію, уладарамі якой яны былі. Кацярына II зрабіла такі абмен з намерам потым падпарадкаваць Расіі дадатковыя землі. Князь Аляксей, які памёр да рэвалюцыі, пахаваны ва ўрочышчы Мірагошч, захавалася надмагілле тых часоў. Жыццё княгіні скончылася трагічна. Падчас рэвалюцыі яе забіў яе ж хрэснік, а маёнтак быў спалены. Слугі паспелі выцягнуць з агню княгіню і пахаваць яе ў радавым склепе. Сыну Міхаілу дапамаглі бегчы за мяжу, і ў 1995 годзе яго нашчадкі перадалі музею дзённік дачкі Алены і Аляксея — Зоі, дзе яна падрабязна апісала ўсе зменлівасці лёсу гэтага сямейства. Цяпер копія дзённіка захоўваецца ў фондах Чэрыкаўскага музея.



Майстры Дома рамёстваў Настасся БЛЯЕВА і Ігар КАМІСАРАЎ.

## ПАРК У ГОНАР ГЕРОЯ І МЕСЦА, ДЗЕ ШАНУЮЦЬ НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Савецкі лётчык-знішчальнік Яўген Нікалаенка — першы ў Магілёўскай вобласці Герой Савецкага Саюза сярод ваенных. Яму гэта званне прысвоена ў лютым 1938 года. Дарэчы, сярод грамадзянскіх асоб у 1937-м гэтым званнем быў узнагароджаны славуты палярнік Ота Шміт з Магілёва за кіраўніцтва арганізацыяй дрэйфуючай станцыі «Паўночны полюс — 1». Яўген Нікалаенка атрымаў Героя за ўдзел у вызваленчай вайне Кітая супраць Японіі. У небе над Уханем ён і яго звяно збіла 16 варожых самалётаў. У гонар Героя ў Чэрыкаве ёсць невялічкі парк каля райваенкамата, дзе сёлета быў устаноўлены савецкі знішчальнік МіГ-29.

**Чэрыкаву пашчасціла, што ён знаходзіцца на шляху, які звязвае адразу некалькі райцэнтраў Магілёўшчыны. Таму толькі з Магілёва туды нават у будні дзень грамадскі транспарт курсіруе ледзь не кожную гадзіну.**

Дарэчы, адтуль не так далёка да раённага Дома рамёстваў, дзе можна купіць сувенір на памяць аб падарожжы на Чэрыкаўшчыну. Яго ўзначальвае маладая майстрыха Настасся Бляева. Яна родам з Віцебшчыны, вучылася на банкіра, адпрацавала ў Чэрыкаве два гады, выйшла замуж і пераарыентавалася на народную творчасць. Захапілася льном, вырабляла паясы, а зараз занялася ткацтвам. Сёлета зрабіла свой першы ручнік. На купальскім фестывалі ў Александрыі яе работа атрымала трэцяе месца ў конкурсе. Настасся прызнаецца, што працавала над ім некалькі месяцаў. «Сказалі, што для першага разу добра, маўляў, нітку я адчула», — усміхаецца дзяўчына.

У сувенірнай лаўцы шмат цікавых вырабаў. Попытам карыстаюцца дамавікі, сувеніры з ільну, дрэва і саломы. У тутэйшага рэзчыка і мастака Ігара Камісарава мінчане заказваюць іконы. Запаветная мара тутэйшых майстроў — засвоіць як мага болей тэхнік і папулярызаваць народныя традыцыі Чэрыкаўшчыны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Чэрыкаўскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ГАЗАВАЕ «РАЛІ»

## Чаму блакітнае паліва зноў у трэндзе?

**Цэны на прыродны газ — сярод найбольш гарачых сусветных навін. Кошт блакітнага паліва на рэкордным узроўні. На працягу года газ у Еўропе падаражэў больш чым на 1000 працэнтаў (і ўшчыльную наблізіўся да ўзроўню расцэнак долар за куб), ва Усходняй Азіі — на 500%, паведаміла iz.ru. Не з'яўляецца выключэннем і Амерыка, дзе цэны няўхільна растуць, нягледзячы на каласальнае павелічэнне здабычы сланцавага газу ў апошнія 10—15 гадоў. Аналітыкі лічаць, што цяперашняя сітуацыя — усур'ёз і надоўга, а эра таннага газу завяршылася. Чаму блакітнае паліва зноў у трэндзе, да чаго прывядзе такая сітуацыя?**

### ШТО АДБЫЛОСЯ?

Дзесяць гадоў таму прыродны газ лічыўся самым перспектыўным палівам. Яго запасы значна перавышалі (і цяпер перавышаюць) запасы нафты ў часы, калі пік здабычы чорнага золата здаваўся не за гарамі. У экалагічнасці ён таксама з лішкам пераўзыходзіў любыя іншыя вугляродныя крыніцы — нават да ўсеагульнага захаплення барацьбой з выкідамі $CO_2$. Узвядзенне новых газаправодаў і развіццё інфраструктуры звадкаванага прыроднага газу (ЗПГ) заўжды было стратэгічным пытаннем, паколькі лічылася, што прыродны газ будзе адыгрываць ключавую ролю ў энергетыцы.

Да сярэдзіны дзесяцігоддзя дыспазіцыя змянілася: бум сланцавага газу ў ЗША перасягнуў усе чаканні аптымістаў, а падзенне кошту нафты ў 2014—2015 гадах моцна скарэкціравала агульны паліўны баланс. Цэны на газ пачалі падаць, і, напрыклад, адзін з найбуйнейшых сусветных вытворцаў — «Газпром» — гэта адчуў самым выразным чынам, калі яго цэннікі для еўрапейскіх краін раптам змяніліся з $400—500 да $150—200 за тысячу кубоў, а месцамі і ніжэй. Дно было дасягнута ў мінулым годзе, калі на фоне масавай пандэміі сітуацыя ўскладнілася яшчэ і цёплай зімой, газ нават у Еўропе ўпаў ніжэй за $100 за тысячу кубоў, а на хабе «Генры» ў ЗША цэны і зусім упалі да 50–55 долараў.

Тым больш дзіўным з'яўляецца цяперашняе «ралі» цэн. Што адбылося? Як паведаміла iz.ru дырэктар па даследаваннях VYGON Consulting Марыя Бялова, асноўнай прычынай з'яўляецца аднаўленне эканомікі і, адпаведна, сыравінных цэн пасля каранавіруснага 2020-га, гэта значыць, па сутнасці, рост з нізкай базы. «Акрамя росту попыту і паляпшэння агульнасусветнай цэнавай кан'юнктуры, цэны на газ растуць і на фоне нізкіх запасаў у сховішчах з-за халоднай зімы і гарачага лета», — заўважыла эксперт.



Кіраўнік расійскага Інстытута энергетыкі і фінансаў Марсель Саліхаў да фактараў чыста эканамічных і прыродных дадае яшчэ і экалагічны. Фактычна парадак дня барацьбы з глабальным пацяпленнем і скарачэннем выкідаў вуглякіслага газу, як ні парадаксальна, на руку як мінімум некаторым вуглевадародным крыніцам энергіі. «Рост цэн на выкіды $CO_2$ у Еўропе, якія таксама выраслі амаль у тры разы за 12 месяцаў, спрыяе мацнейшаму падаражанню газу», — заўважыў эксперт. Такі расклад «павялічвае канкурэнтаздольнасць газавай генерацыі ў параўнанні з вугальнай і спрыяе росту цэн на газ».

### ПОПЫТ АБГАНЯЕ ПРАПАНОВУ

Попыт на калісьці даступнае паліва моцна перавысіў прапанову і прывёў да скачка цэн па ўсім свеце, заўважыла Bloomberg. Цяпер на фоне спынення паставак з ЗША ў Аўстралію і павышанага попыту ў Азіі цэны рэзка ўзляцелі. Павелічэнне кошту блакітнага паліва закране ў выніку ўсе галіны сусветнай эканомікі і ўзмоцніць рызыку інфляцыі. Выдаткі электрастанцый і нафтахімічнай прамысловасці павялічацца, а значыць, спажыўцы атрымаюць больш высокія рахункі за электраэнергію і газ.

Як адзначаюць аналітыкі, у перспектыве свет будзе залежаць ад гэтай крыніцы энергіі. Многія краіны аддадуць перавагу блакітнаму паліву як больш чыстаму гаручаму, калі адмовяцца ад вугалю ў пагоні за скарачэннем выкідаў. «Незалежна ад таго, што вы думаеце з гэтай нагоды, газ працягне быць пераходным да чыстай энергіі палівам наступныя некалькі дзесяцігоддзяў. Пры гэтым яго кошт не ўпадзе



ў найбліжэйшы час і стане яшчэ вышэйшы ў доўгатэрміновай перспектыве», — заявіў галоўны выканаўчы дырэктар аналітычна-кансалтынгавай кампаніі Macro-Advisory Крыс Уіфер.

**Сярод галін, якія мацней за ўсё пацярпелі ад падаражання газу, аказаліся хімічная прамысловасць, вытворчасць «сіняга» вадароду і сталеліцейныя кампаніі. Аднак кіраўнік дэпартамента энергетычных праектаў FinExpertiza ў Венгрыі Матэ Той заявіў, што неўзабаве «практычна любы бізнес» сутыкнецца з павелічэннем выдаткаў, паколькі ацяпленне і вытворчасць энергіі становяцца больш затратнымі.**

Сярод фактараў, якія паўплывалі на павышэнне цэн на газ, ёсць аднаразовыя. У тым ліку выкліканыя каранавірусам перабоі ў ланцужках паставак і аднаўленне эканомікі ад наступстваў пандэміі. Аднак эксперты лічаць, што, акрамя гэтага, паўплываў перагляд многімі краінамі энергетычнай стратэгіі: яны вырашылі перайсці на газ, каб хутка і з мінімальнымі выдаткамі пачаць скарачэнне вугляродных выкідаў.

Камунальныя прадпрыемствы ў Еўропе пераходзяць на самае чыстае гаручае паліва па прычыне завоблачных квот на вугляродныя выкіды, а ўрады краін Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі плануюць дзясяткамі новых газавых электрастанцый пакрыць патрэбы ў электраэнергіі. Кітай, напрыклад, мае намер залежаць ад газу больш, чым калі-небудзь: Паднябесная імкнецца рэзка адмовіцца ад вугальнага паліва.

Паводле даных Міжнароднага энергетычнага агенцтва (МЭА), да 2024 года попыт на прыродны газ вырасце на сем працэнтаў у параўнанні з дапандэмічным узроўнем. А, згодна з аналізам McKinsey & Co, кожны год да 2035-га ён будзе запатрабаваны на 3,5 працэнта.




Звычайна высокі попыт стымулюе прыток інвестыцый у новыя экспартныя магутнасці. Аднак адным з галоўных фактараў павышэння цэн на газ стаў недахоп капіталу для нарошчвання паставак. Буйныя энергетычныя кампаніі былі вымушаны перагледзець свае планы з-за даследаванняў аб небяспецы газу для атмасферы. У пачатку года МЭА заявіла, што для дасягнення нулявых выкідаў да 2050 года неабходна спыніць інвестыцыі ў газавыя праекты.

Віцэ-старшыня даследчай кампаніі ў галіне энергетыкі Wood Mackenzie па Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне Гэвін Томпсан лічыць, што без новых інвестыцый попыт на ЗПГ у Азіі да 2035 года перавысіць прапанову на 160 мільёнаў тон. Для параўнання: у 2020-м у рэгіён было імпартавана 250 мільёнаў тон.

### НАПЯРЭДАДНІ ХАЛАДОЎ

Высокія цэны на газ у Еўропе прывялі да таго, што некаторыя прадпрыемствы вымушаны пачынаць скарачаць вытворчасць, паведаміла Bloomberg. Буйны амерыканскі вытворца ўгнаенняў CF Industries закрыў два заводы ў Вялікабрытаніі. Нарвежская кампанія той жа спецыялізацыі — Yara International ASA — напрыканцы мінулага тыдня заявіла, што скарачае выпуск аміяку, патлумачыўшы, што пайсці на гэты крок яе прымусілі рэкордныя цэны на газ.

Напярэдадні зімовых халадоў у еўрапейскіх сховішчах заканчваецца газ, запасы знізіліся да рэкордна нізкага ўзроўню, а ацяпляльны сезон ужо пачынаецца. Газавы крызіс перашкаджае еўрапейскай эканоміцы аднаўляцца пасля лакдаўну. Goldman Sachs Group раіць прамысловым спажыўцам рэгіёна пачаць скарачаць энергаспажыванне з-за ўстойлівага росту цэн. Выканаўчы дырэктар Міжнароднага энергетычнага агенцтва Фаціх Бірол заявіў, што кошт блакітнага паліва можа заставацца высокім у найбліжэйшай перспектыве, а былы кіраўнік энергетычнага рэгулятара Вялікабрытаніі Ofgem папярэдзіў, што рахункі за газ і электраэнергію ў Еўропе будуць павялічвацца паўгода.

Сярод галін, якія мацней за ўсё пацярпелі ад падаражання газу, аказаліся хімічная прамысловасць, вытворчасць «сіняга» вадароду і сталеліцейныя кампаніі. Аднак кіраўнік дэпартамента энергетычных праектаў FinExpertiza ў Венгрыі Матэ Той заявіў, што неўзабаве «практычна любы бізнес» сутыкнецца з павелічэннем выдаткаў, паколькі ацяпленне і вытворчасць энергіі становіцца больш затратнымі.

### НІЧОГА НЕ ВЫРАШЫЛІ

Дэфіцыт газу пагражае Еўропе ростам цэн і перабоямі з харчаваннем. Ужо пачалі расці рахункі за святло і газ, некаторыя краіны таксама сутыкнуліся з недахопам угнаенняў, паведаміла «Бі-бі-сі». Паводле звестак Action News Now, аптовы кошт прыроднага газу вырас да рэкордных значэнняў у Вялікабрытаніі, Францыі, Іспаніі, Германіі ды Італіі.

Як перакананы эксперты, цэны на газ працягнуць біць рэкорды. Вынікам стануць «рост незадаволенасці сярод і без таго збяднелых у пандэмію выбаршчыкаў, а роўна і пагроза іх далейшага збяднення з прычыны таго, што большыя камунальныя выдаткі стрымліваюць спажыванне — галоўны рухавік еўрапейскай эканомікі», — паведамляе BBC.

**Сярод фактараў, якія паўплывалі на павышэнне цэн на газ, ёсць аднаразовыя. У тым ліку выкліканыя каранавірусам перабоі ў ланцужках паставак і аднаўленне эканомікі ад наступстваў пандэміі. Аднак эксперты лічаць, што, акрамя гэтага, паўплываў перагляд многімі краінамі энергетычнай стратэгіі: яны вырашылі перайсці на газ, каб хутка і з мінімальнымі выдаткамі пачаць скарачэнне вугляродных выкідаў.**

Паводле даных нямецкага выдання Bild, жыхары Германіі, якія ацяпляюць жыллё газам, павінны быць гатовыя да рэзкага росту цэн на энерганосьбіты. Эксперт Commerzbank па сыравіне Карстэн Фрыч папярэджвае, што самая дарагая зіма ўсіх часоў у Германіі непазбежная. Прычынай з'яўляюцца рэкордныя цэны на газ і электраэнергію, а таксама рэзка ўзрослыя цэны на мазут. Дзясяткі камунальных прадпрыемстваў ужо павысілі расцэнкі, аргументуючы дадзеную меру павелічэннем закупачных цэн на прыродны газ з-за рэзка павялічанага попыту пасля таго, як эканоміка выйшла з пандэміі, а таксама адносна апусцелымі сховішчамі.

Як заўважыла «Бі-бі-сі», вельмі нявыгадна сітуацыя складваецца ў Вялікабрытаніі, якая выйшла з ЕС. Цэны там растуць хутчэй, а эканоміка аднаўляецца павольней, чым у еўрапейскіх суседзяў, паколькі, акрамя каранавіруса, адбіваюцца наступствы брэксіту, а цяпер яшчэ і дарагога газу. «Брытанскі досвед дэманструе, як дэфіцыт газу можа абярнуцца харчовым крызісам», — адзначыла «Бі-бі-сі» і паведаміла, што мясцовыя фермеры і супермаркеты ўжо папярэдзілі аб вялікай верагоднасці павышэння цэн на прадукты харчавання.

Днямі міністры энергетыкі краін ЕС абмеркавалі сітуацыю і нічога не вырашылі, але еўракамісар Кадры Сімсан паабяцала, што Еўракамісія ў найбліжэйшыя тыдні распрацуе агульныя рэкамендацыі: як палегчыць крызіс для 450 мільёнаў жыхароў 27 краін супольнасці.

Тым часам, як вядома, цана на газ для Беларусі ў 2022 годзе захаваецца на сёлетнім узроўні. Пра гэта Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў па выніках перагавораў з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам у Маскве, паведаміла БелТА. Акрамя таго, паводле яго слоў, прадугледжана заключэнне дагавора аб аб'яднанні рынкаў нафты і нафтапрадуктаў, а таксама дагаворы аб адзіным рынку электраэнергіі. Як удакладніў расійскі лідар, цана на прыродны газ для Беларусі будзе захавана на ўзроўні 128,5 долара за тысячу кубаметраў. Акрамя таго, расійскі бок, па словах Уладзіміра Пуціна, не індэксуе цану на газ для нашай краіны, выходзячы з доларавай або рублёвай інфляцыі.

**Захар БУРАК.**

## БРЕСТСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
### извещает о проведении повторного открытого аукциона

**Лот:** капитальное строение с инвентарным номером 111/С-13490 (наименование: телятник; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 669,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Новоселковский с/с, д. Прончаки, ул. Луговая, 3А, на земельном участке с кадастровым номером 125083606101000124, площадью 1,7655 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 28 197,46 | Размер задатка, руб.: | 2 819,75 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Путь новый», УНП 200058085, тел./факс 80163331732. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 13 октября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

**Последний день приема заявлений – 12 октября 2021 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Продавец**: Открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы», 210034, Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-49507 площадью 116,5 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное здание и магазин, назначение – здание многофункциональное. Капитальное строение с инв. № 200/С-49508 площадью 31,0 кв. м. по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – проходная, назначение – здание неустановленного назначения.

Капитальное строение с инв. № 200/С-49509 площадью 91,1 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: тамбур. Капитальное строение с инв. № 200/С-49510 площадью 116,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – гараж и бытовка, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Капитальное строение с инв. № 200/С-49511 площадью 280,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка. Капитальное строение с инв. № 200/С-49512 площадью 2120,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – материальный склад №№ 1, 4, 6, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, навес, отдельная рампа, рампа. Капитальное строение с инв. № 200/С-49513 площадью 1131,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад №№ 2, 3, 5, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, рампа, навес. Обременение: договора аренды № 1/2016 от 01.01.2016 сроком по 31.12.2023, № 1/2015 от 02.02.2015 сроком по 31.12.2023. Капитальное строение с инв. № 200/С-59958 протяженностью 389,30 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Капитальное строение с инв. № 200/С-106672 площадью 6470,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение, трое ворот, бетонная площадка, три калитки, подпорная стена. Вышеуказанные объекты находятся на зем. участке с кадастровым № 240100000003000082 площадью 1,4611 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания универсальной оптовой базы (право постоянного пользования). Капитальное строение с инв. № 200/С-59954 протяженностью 35,80 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – хозбытовая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Капитальное строение с инв. № 200/С-59955 протяженностью 426,45 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – электрическая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Капитальное строение с инв. № 200/С-59956 протяженностью 57,85 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – водопроводная сеть, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Капитальное строение с инв. № 200/С-59957 протяженностью 70,75 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. **Нач. цена: 418 200,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 41 820,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения повторного аукциона**: **27.10.2021 в 15.00 по адресу**: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 27.09.2021 с 8.30 по 26.10.2021 г. до 17.30. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга», № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.**

**Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 12.06.2021, 04.08.2021.**
**Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета аукциона после согласования сделки и договора купли-продажи с ОАО «Белресурсы» – управляющей компанией холдинга «Белресурсы», но не позднее 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплата расходов по гос. регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на недвижимое имущество осуществляется за счет Покупателя. *Затраты по подготовке документации по лоту № 1 (проведение независимой оценки) составляют 2156,00 бел. руб. без НДС.* **Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 6470770 – Буевич Алексей Демьянович.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
|---|---|
| Продавец | **ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 470-18Б/2017** |
| **Предмет аукциона** | |
| **Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО»** (регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 04 января 2019 г.). Состав имущества и имущественных прав см. на сайте ipmtorgi.by | |
| Месторасположение производственной базы – **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины** | |
| **Начальная стоимость без НДС – 61 200,00 бел. руб.** (снижена на 10 %) Шаг аукциона без НДС – 3 060,00 бел. руб. | |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30 |
| **Задаток 3 %** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях перечисляется на Р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка» | |
| **Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяются ст.ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».** Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 **14.10.2021** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного закона. Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену. Порядок оформления результатов торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов | |
| Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте ipmtorgi.by | |
| Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 23.07.2021; в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие». – 2021. – № 7. – С. 56-57 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Аукцион состоится 15.10.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 24.09.2021 по 14.10.2021 до 17.00** по указанному адресу | |

**Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, ipmtorgi.by.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

**Считать недействительным** утерянный ЗАО «СК «Белросстрах» бланк страхового полиса: «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско)» форма 2РН, 2РП серия АК № 0145824.

УНП 100782388

## Извещение о проведении 06 октября 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МЗАЛ им. П.М.Машерова»

**Сведения о продаваемом имуществе**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-10091 общей площадью 4 293,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/13, наименование – модельный цех со складом моделей (лит. Е 1-2/к), назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения) | Общее долевое право постоянного пользования на земельный участок площадью 19,0241 га, кадастровый номер – 500000000001002170 | 1 246 320,0 | 124 000,0 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-47411 общей площадью 2 881,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/12, наименование – корпус очистных сооружений, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения | | 874 080,0 | 87 000,0 |
| 3 | Капитальное строение* с инвентарным номером 500/С-52784 общей площадью 10 546,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18/8, наименование – литейный цех, назначение – здание специализированное для металлургического производства и металлообработки | | 2 965 680,0 | 296 000,0 |
| 4 | Капитальное строение** с инвентарным номером 500/С-17398 общей площадью 19 918,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 18, наименование – литер В 1-3/к, блок цехов, назначение – здание неустановленного назначения | | 7 576 320,0 | 757 000,0 |

** Часть капитального строения (назначение – ЦРП) площадью 156,9 кв. м, примыкающая к зданию литейного цеха с инвентарным номером 500/С-52784, не подлежит сносу или переносу и является неотъемлемой частью ОАО «МЗАЛ им П.М. Машерова»;*
*** Площади капитального строения освобождаются продавцом имущества в течение года*

**Продавец имущества:** ОАО «МЗАЛ им. П.М. Машерова», ул. Долгобродская, 18, 220037, г. Минск

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

